18+

Мікола Адам

# Вольны птах



## Мікола Адам

# Вольны птах. Раман

*http://www.litres.ru/pages/biblio_book/?art=70561360*
*ISBN 9785006276949*

### Аннотация

Сярэдзіна 1990-х. Мінск. Каханне. Жыццё і смерць. Малады чалавек сустракае дзяўчыну, чыя знешнасць і жыццё – суцэльная тайна. Аднак каханне творыць дзівосы.

# Содержание

MІКОЛА АДАМ 5
Конец ознакомительного фрагмента. 65

# Вольны птах
# Раман
# Мікола Адам

© Мікола Адам, 2024
ISBN 978-5-0062-7694-9
Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero

# МІКОЛА АДАМ
# ВОЛЬНЫ ПТАХ
# (раман)

*І зноў рукі – крылы.*
*На мяжы быцця і небыцця*
*Світае трывога святая. Болей*
*Не будзе абрыдлага болю.*
*Я – Вольны Птах.*
*А ўнізе – зямля белая*
*Ляжыць. Аблокі сплываюць за*
*Прастор пад зорамі. Бліскавіцы*
*Мігцяць і падаюць ніцма.*
*Вочы загінуць там,*
*Дзе не будзе мяне заўтра.*
*Крылы згараць там,*
*Дзе не будзе мяне заўтра.*
*Я застануся там,*
*Дзе не будзе мяне заўтра.*
*Я – Вольны Птах.*
*(Янка Лайкоў)*

10 кастрычніка 1997 года я памёр. Сэрца спынілася на 58 секунд падчас таго, як доктар 9-й клінічнай бальніцы горада Мінска Шкодзік выкалупліваў з маёй прабітай гала-

вы аскепкі цемяннаой косткі справа. Відаць, нешта зачапіў у мозгу, бо кавыраўся менавіта ў ім, чысціў яго, як марожанае ў вафельнай аздобе, куды трапіла шкло ад магчымай разбітай вітрыны ў магчымай кавярні.

Я тады працаваў спецкарэспандэнтам газеты «Культура». Гучная пасада на самай справе не мела анічога гучнага ў рэчаіснасці. І хоць я меў суадноснае пасведчанне, мае абавязкі пачыналіся і заканчваліся «падай-прынясі». Галоўным чынам я адвозіў у Дом друку звярстаную і спампаваную на дыскету газету, каб яна паспела выйсці ў загадзя абгавораны тэрмін. Выйсці, звычайна, выданне паспявала, аднак з тэрмінамі здачы ў друк амаль увесь час спазнялася. Гэта было маё першае афіцыйнае месца працы. Менавіта ў «Культуры» я зарабіў працоўную кніжку і распачаў працоўны стаж.

У той дзень ці, хутчэй, вечар, бо звычайна ў Дом друку я накіроўваўся менавіта ўвечар і амаль да ночы чакаў там сваёй чаргі (Дом друку адзін, а выданняў, чыё выданне ён забяспечваў, – безліч), нешта ў лесе здохла: газету зрабілі раней вызначанага тэрміну. Вядома, мне перадалі яе на дыскеце, але я не мусіў бегчы ў Дом друку на злом галавы, а заўтра зранку мог не спяшаючыся і разняволена здзівіць працаўнікоў друку, якія ўжо звыклі да нязменнага спазнення і звярталіся да мяне ці да сябе, калі я з’яўляўся на гарызонце іх жыцця, не інакш як «о, культура прыджгала, не прайшло і году». Я наўпрост бачыў іх подзіў на тварах заўтрашняга дня і ўсміхаўся ўсю дарогу да дому (трохпавярховай старой забу-

довы на Катоўскага з прахадным дваром і гаражамі ды вялізазнай разгалістай алычой пасярод двара), у якім здымаў аднапакаёвую кватэру. Пад алычой на лаўцы я прысеў пакурыць, уяўляючы, з якім задавальненнем неўзабаве павячэраю пельменямі з кефірам, набытымі па дарозе ў краме, бо цэлы дзень нічога не еў, адно курыў. Курывам, калі шчыра, ежу і замяняў, яно забівала голад, спосаб правераны не адным пакаленнем. Яшчэ не было цёмна, але высокі ліхтар, што тырчаў побач з алычой, асвятляў двор і мяне пад алычой так, нібы ўдаваў сябе за сонца. Я дакурваў, калі ў двор зайшлі міліцыянты. Утрох. У форме мышынага караля. Рэйд у іх быў ці нейкая іншая трасца прывяла сюды – пайдзі разбяры. Зрэшты, мая міліцыя мяне беражэ, праўда ж?

– Чё сидим? – данеслася з іх боку да мяне. Я яшчэ азірнуўся, каб упэўніцца, што не памыліўся. І сапраўды, звяртацца не было больш да каго.

– Куру вось, – адказаў я і наіўна запытаў: – Нельга?

– Курить здоровью вредить, – заўважыў адзін з іх.

Тым часам двое міліцыянтаў падыходзілі да алычы, пад якой сядзеў я, а трэці чамусьці абыходзіў алычу з тылу. Усе трое – маладыя, сытыя, адкормленыя.

Ім не спадабаліся мае доўгія валасы і беларуская мова, якой я з імі размаўляў. Яны палічылі, што я бэнэфавец, а таму перашкаджаю ім жыць. Я запытаў, якім чынам перашкаджаю жыць менавіта ім, і ў наступную секунду адчуў шолах з-за спіны, падобны на пошум крылаў, а затым боль у галаве і

млоснасць. Трэці міліцыянт некалькі разоў нечым вострым і цяжкім прыклаўся да маёй галавы. Я споўз з лаўкі на зямлю, каб прымаць ужо ўсім целам удары берцаў міліцыянтаў, засяроджаных і маўклівых. Яны толькі саплі ад напругі. Магчыма, не хацелі выпадкова прыцягнуць увагу да сябе.

Не памятаю, у які момант я страціў прытомнасць, але да цямы прыйшоў дзякуючы халодным дотыкам да твару нечых далоняў. Не без цяжкасцяў разляпіў вочы і сустрэўся з вачыма дзяўчыны, прыгажэй за якую ніколі не бачыў ні раней, ні пазней. Ва ўсякім разе так здавалася пад святлом ліхтара.

– Эй, ты жывы? – ляпала яна па маіх шчоках далонямі.

Яе бялявыя, як снег, але не сівыя, валасы, быццам падушачкамі пальцаў, краналіся маіх губ. Непрытворная заклапочанасць у глыбокім калодзежы позірку, блакітным, як бязвоблачнае неба, абнадзейвала да нечага светлага. Перад ім карцела выглядаць героем, якім я і памкнуўся стаць, зразумела, няўдала, бо рэзкі боль у баках пад рэбрамі ад першай жа спробы падняцца ледзьве не адправіў мяне ў накаўт. Добра, што стрымаў крык. А мо не стрымаў? У вачах дзяўчыны вавёркамі праскакаў спалох. Дзіўна, што яна ўвогуле звярнула ўвагу на мяне і не палічыла шараговым п’янтосам. Я б на яе месцы дакладна прайшоў міма паўз сябе такога. Сердабольная ці што? Ужо злаваў на дзяўчыну з-за ўласнай бездапаможнасці, а мне ўсяго 19 гадоў. Тым не менш разумеў, што без яе дапамогі – хана. Яна тады паспрабавала зварухнуць мяне самастойна, дапамагчы падняцца хаця б

на лаўку, каб не ляжаць на халоднай восеньскай зямлі, зайшла за спіну, прасунула рукі пад пахі…

– Ой, бля!.. – пачуў я выразна над галавой. Відаць, дзяўчына пабачыла зверху нешта страшнае, напэўна, рану ці кроў у валасах. – Дапамагай мне, чуеш, я не завалаку цябе сама, – нахілілася над вухам, – тут два крокі да пад'езда. Трэба «хуткую» выклікаць…

А тэлефонаў мабільных тады яшчэ не прыдумалі. Яшчэ нават пэйджараў не было. Ва ўсякім разе я ні ў кога не бачыў са знаёмых.

Мы напружыліся. Ад болю пад рэбрамі (здавалася, што нехта ці нешта з задавальненнем водзіць нажоўкай туды-сюды) цямнела ўваччу, не слухаліся ногі, падгіналіся бы лялечныя. Дзіўна, што не балела галава, а мо я проста не адчуваў з-за іншага болю. Урэшце рэшт дзяўчыне ўдалося паставіць мяне на ногі і завалакчы ў адзін з пад'ездаў, які быццам пазіраў на нас наўпрост раззяўленай цьмяна асветленай зяпай з-за напята распахнутых дзвярэй. (Недзе праз год я зайду ў гэты ж пад'езд разам з акторамі трупы Тэатру на філфаку адзначаць прэм'еру «Дон Жуана» ў кватэры Андрэя Курэйчыка, які тады вучыўся на юрфаку і стаяў ля вытокаў тэатральнай дзейнасці пад кіраўніцтвам Глебавых – маці і сына. Не памятаю дакладна ўсіх тых, хто апынуўся ў кватэры будучага драматурга і рэжысёра, але добра памятаю, як насіў па кватэры на руках Олю Сутарміну – лёгкую, бы пёрка). Краем вока паспеў заўважыць, што пакунак з пельменямі і

кефірам знік, і тым, хто прыбраў яго, пажадаў падавіцца.

Дзяўчына праткнула ключом бакавыя дзверы кватэры на першым паверсе, прасунула руку ў цемрыва, намацала выключальнік. Загарэлася святло ў вітальні, і я рухнуў на тумбачку трумо. Дзяўчына памкнулася да тэлефона – чырвонага і дыскавага – што нібы кошка адпачываў на паліцы насупраць, выклікала «хуткую» і назвала адрас. Яна не запытала ў мяне, дзе я жыву, хто я такі, як апынуўся ў двары пад алычой збіты на горкі яблык. Зрэшты, на твары слядоў ад збіцця не назіралася. Напэўна, падсвядома я закрываўся рукамі, яны ўжо пачыналі смылець. Пад вачыма, праўда, збіралася чарноцце кінгаўскай імглой, але, як пасля даведаўся, гэта нармальная з'ява для чэрапна-мазгавых траўмаў.

Дыхаць, седзячы, было цяжка. Калі ляжаў, здаецца, дыхалася лягчэй.

Дзяўчына нервова тузалася па кватэры, палівала кветкі, што стаялі ў вазонах на падваконнях.

«Хуткая» прыехала на дзіва хутка.

Маладому доктару хапіла аднаго пагляду на мяне, каб сказаць: забіраем. Ён вылупіўся на дзяўчыну, відаць, чакаючы яе згоды ці нейкіх іншых дзеянняў. Я бачыў, як яна вагалася, нешта вырашала сама з сабой, а потым паведаміла, што едзе са мной.

Прывезлі ў 2-ю клінічную. Дзяжурны доктар адразу адправіў на здымак, але затым ніводнага разу не глянуў на яго, апрацаваў рану, зашыў і ўсё, гудбай.

– Якое гудбай?! – абурылася мая ратаўніца. – Вы здымак бачылі, там мінімум уціснуты пералом цемянной косткі! Дый з рэбрамі што?

– Ты што, доктар, што ўсё пабачыла праз валасы? – незалюбіў дзяжурны доктар. Яму не хацелася нічога складанага, ён быў стомлены, знерваваны… І я яго разумеў, мне таксама карцела сысці як найхутчэй, дабрацца да «Сямёркі» на Кастрычніцкай, трапіць у інтэрнат і адляжацца ў каго-небудзь з аднакурсніц (я вучыўся на трэцім курсе філфака ў той час, але страціў інтэрнат, таму пайшоў працаваць, каб аплочваць здымнае жыллё). Чамусьці не сумняваўся, што мне проста неабходна ў «Сямёрку», магчыма, бліжэй да людзей, знаёмых і правераных. Фраза пра ўціснуты пералом мяне насцярожыла…

Дзяжурны доктар узяў здымак майго чэрапа, пачаў узірацца ў яго, і выраз твару яго з лянівага і абыякавага выразна змяніўся за лічаныя секунды ў неспакойны і ўсхваляваны. Ён адправіў мяне на паўторны здымак, параўнаў затым абодва, пачаў некуды тэлефанаваць, пасля чаго да нас падышла маладая дактарыца, таксама, відаць, дзяжурная, і сказала, што павязуць мяне ў Дзявятую, адно трэба пачакаць машыну, якая з хвіліны на хвіліну будзе. І ў той момант я зразумеў, што, калі б не дзяўчына, не інакш анёлам-ахоўнікам узніклая раптоўна ў маім жыцці, я б здох праз гадзіны тры па дарозе дадому альбо, апынўшыся ўсё ж дома, лёг спаць і ранкам не прачнуўся б. Мяне перасмыкнула ад усведамлення магчымага фі-

налу і невыносна захацелася курыць. Я ўстаў з вазка, на якім сядзеў, як інвалід, і пакіраваў да выхаду на вуліцу пад наглядам здзіўленых позіркаў прысутных. Колькі секунд яны маўкліва, быццам ім адняло мову, узіраліся ў мае перасоўванні. Я даволі трывала трымаўся на нагах, чым здзівіў сам сябе, не адно дзяжурных дактароў і маю ратаўніцу. Значыць, рэбры не пашкоджаныя, хіба што крыху пакоцаныя. Дактарыца (яна з доктарам аб нечым шушукалася, перакатваючы з кута ў кут вуснаў у чырвонай памадзе шарыкавую асадку), відаць, першаю прыйшла да цямы і занепакоеным голасам быццам дагнала мяне, каб спыніць:

– Вы ж толькі глядзіце не збяжыце!

– Не збяжыць, – апярэдзіла мяне з адказам дзяўчына, якой я быў абавязаны жыццём, і борзда апынулася побач.

– Я пакурыць, – прагучалі мае словы, хутчэй за ўсё, як апраўданне.

Дактарыца кіўнула, маўляў, зразумела, і зноў зашушукалася аб нечым з доктарам.

Мы выйшлі пад брыль. На вуліцы церусіў дождж. Дзяўчына працягнула дажджу сваю руку, я падумаў, каб ён пацалаваў яе, аднак на самай справе, каб пагладзіць яго, бы сабаку. Так яна мне растлумачыла. Я паціснуў плячыма: у кожнага свае закідоны. І закурыў. Дзяўчына папрасіла яе пачаставаць цыгарэтай і сказала:

– Я – Насця.

Так проста і нязмушана. І з той хвіліны імя яе для мяне

стала адзіным найлепшым імем з усіх жаночых імёнаў у свеце.

Я назваўся таксама. Яна кіўнула, маўляў, адобрыла.

Тады я ўзгадаў пра газету, якую заўтра трэба было завесці ў Дом друку, што не ўяўлялася магчымым, улічваючы абставіны. Трэба было камусьці тэлефанаваць з работы, папярэдзіць, што я не змагу… Насця заўважыла маю заклапочанасць на твары, папыталася, што здарылася. Без усякай задняй думкі я вываліў на яе яшчэ і гэта.

– Дык ты журналіст? – адзначыла для сябе яна і зрабіла сугадносныя высновы, у тым ліку, што збіць мяне маглі за прафесійную справу.

«Ды які я журналіст?» – ледзь не прызнаўся я ў адваротным, але чамусьці змаўчаў, да таго ж дзяўчына ўжо пагаджалася завесці дыскету з газетай ў Дом друку за мяне. І я не сумняваўся, што яна не падвядзе, працягнуў пропуск на тэрыторыю і дыскету дастаў з унутранай кішэні скуранкі.

Пад'ехала машына, да нас выйшла дактарыца, і мы пакіравалі на Сямашка.

Мяне ўжо чакалі ў аперацыйнай нейрахірургічнага аддзялення, спачатку, праўда, завялі ў кабінет да доктара, які мусіў правесці аперацыю. Насця і тут не пакінула мяне аднаго. Доктар прапанаваў нам сядаць, а сам уважліва вывучаў здымак ды іншыя дакументы, перададзеныя дактарыцай з 2-й клінічнай бальніцы. Неўзабаве адклаў здымак, шумна выдыхнуў і запытаў у мяне, ці ёсць у Мінску блізкія сваякі.

– Адкуль? – шчыра адказаў я.

– На падобныя аперацыі патрэбны дазвол сваякоў, – патлумачыў ён. – Вы можаце, вядома, і самі падпісацца, але аднаго вашага аўтографа недастаткова.

У мяне пахаладала ў грудзях. Дакладна вельмі сур’ёзна ўсё, калі адказнасць за магчымую няўдачу перакладаецца на плечы пацыента.

– Я падпішу, – мовіла Насця і абнадзейвальна сціснула маю далонь у сваёй.

– Вы хто? – утаропіўся доктар позіркам у дзяўчыну.

– Сваячка, – адказала дзяўчына. – Дальняя, – дадала дзеля пэўнасці.

– Ну, – працягнуў доктар, – тады ўсё добра. – Працягнуў нам загадзя падрыхтаваную паперу. – Падпісвайце.

Я падпісаў не чытаючы. Насця азнаёмілася з тэкстам дакумента і падпісала таксама. Вярнула яго доктару і запытальна зірнула на яго, маўляў, што далей.

– Вы, – звярнуўся ён да яе, – напэўна, можаце ехаць дамоў. Прыязджайце заўтра.

– Добра, – згодна кіўнула Насця і падышла да мяне. Разам мы выйшлі на калідор.

– Я ўсё зраблю, ты не хвалюйся, – паабяцала. – Пабачымся яшчэ…

– Пачакай, – спыніў я дзяўчыну і палез па грошы, каб адзячыць хоць чым, хаця б за таксі заплаціць. У мяне нічога не забралі, калі не ўлічваць кефіру з пельменямі, проста збілі

і ўсё, а літаральна ўчора атрымаў заробак, то грошы меліся.

– Не трэба нічога, – зразумела, відаць, адразу Насця сэнс маіх патуг. – Потым разлічымся, – усміхнулася. Ад усмешкі яе сэрца ў грудзях завуркатала кацянём. – Не сумнявайся, усё будзе добра, – прыхінулася на імгненне. – Да сустрэчы! – пацалавала ў шчаку і, не азіраючыся, пакіравала да ліфта, а мяне медсястра (сталага веку жанчына, ці мне гэтак падалося, бо ў яе вытыркалася сівая пасма з-пад асноўнага масіву валасоў, сабраных у гулю на патыліцы, і спускалася паўмесяцам ад скроні да шчакі) завяла ў працэдурную і пастрыгла налыса. Сцэна стрыжэння адзін у адзін паходзіла на эпізод з фільма «Па мянушцы «Звер» з удзелам маладога Д. Пяўцова, які выконваў ролю Савелія Гаваркова, хіба што прычыны адрозніваліся. Спачатку жанчына адрэзала нажніцамі хвост, сабраны з маіх валасоў, а потым філіровачнай машынкай без насадкі знізу ад шыі ўверх быццам узворвала цаліну. Адразала лусты чарназёму, якія, нібы з плуга, падалі на падлогу.

У невялікім тамбуры паміж калідорам і аперацыйнай сустрэлі дзве аперацыйныя маладыя медсястрычкі з усмешлівымі добразычлівымі вачыма. У адной з іх вочы здаваліся густа зафарбаванымі карычневым фламастарам, як у гераінь дзіцячых расфарбовак. Вочы другой нагадвалі летні, насычаны зялёным колерам лес пасля дажджу. Я нават адчуў пах гэтага лесу, хоць з нараджэння не чую аніякіх пахаў увогуле. Першая вялела скідаць з сябе ўсё адзенне. Я, памятаю, перапытаў: у сэнсе ўсё? Яна адказала, што ў прамым, дагала,

такія правілы. На кушэтцы пад сценкай якраз чакала загадзя падрыхтаваня каробка, у якую другая медсястра па меры распранання складвала мае рэчы.

– А божжа мілы! – зрэагавала каравокая медсястра на гематомы па ўсім целе. – Ты што, з фронту?..

– Ага, – адразу адгукнуўся я, – з-пад Сталінграда.

Дзяўчаты захіхікалі, але, відавочна, не з майго няўдалага жарту. Напэўна, голым я выглядаў пацешна. Да таго ж ганарліва выпрастаўся, каб рашуча пакіравацьда аперацыйнага стала. Што ж, гонару хапіла на колькі крокаў, а затым мяне павяло ўбок. Не хапала яшчэ страціць раўнавагу і пабіць галаву аб падлогу. Вось была б іронія лёсу. Дзяўчаты кінуліся на дапамогу. Ад сораму не ведаў куды сябе падзець, але ўсё ж даў зразумець, што сам, сам дабяруся да месца канчатковага прызначэння. Паверылі.

Ускараскаўся пад лямпы. Медсястра з зялёнымі вачыма накрыла мяне прасцінай да грудзіны. Іншая медсястра рыхтавала руку для ўвядзення наркозу.

– Зараз зробім табе ўкольчык, ты далічыш да дзесяці і заснеш, – сказала яна і пракаментавала яшчэ ўвод наркозу ў вену: – А таўстаскуры які!..

Я не паверыў, што можна далічыць да дзесяці і праваліцца ў сон, аднак паспеў далічыць адно да трох.

Ачомаўся я ад недахопу кіслароду. Дыхаць не было чым. Здавалася, нехта наўмысна, як трубы, перавязаў дыхальныя шляхі. І смага паліла ўнутры агнём. Піць хацелася невынос-

на. Я намагаўся папрасіць вады, але не мог вымавіць ні гуку. Зрок не слухаўся. Вочы нічога не бачылі. У іх адсутнічала рэзкасць, як у неналаджаным фотааб'ектыве. Адно нейкія невыразныя цені плавалі перад вачыма. Напэўна, пачаў размахваць рукамі, павыдзіраў кропельніцы, бо адчуў, як з двух бакоў рукі мае прыціскаюць да нечага халоднага і цвёрдага.

– Куды сабраўся ўжо? – пачуў голас медсястры з зялёнымі вачыма. – Яго ледзьве з таго свету выцягнулі, а ён на гулі, не іначай, намыліўся.

Пасля яе слоў зноў некуды ўсё знікла, як пасля таго, калі я далічыў да трох. Толькі праз суткі, нарэшце, здолеў сяк-так расплюшчыць вочы і адэкватна рэагаваць на рэчаіснасць у палаце на двох, голы, хоць і пад прасцінай. З эпікрызу з цягам часу даведаўся, што доктарам-нейрахірургам «зроблена экстраная хірургічная аперацыя адкрытага ўціснутага пераламу цемяннной косткі сярэдняй цяжкасці справа, ушыбу галаўнога мозгу з лёгкім гіпертэнзіўным сіндромам, умеранымі вегетасасудзістымі парушэннямі і мікраачаговай сімптаматыкай. Становішча пасля аперацыі: дэфект цемяннной косткі справа памерам 2,5 х 1,5 см (іншымі слова яе там няма), непрацаздольны. Рэкамендуецца акадэмічны адпачынак». Подпісы лекуючага доктара, загадчыка нейрахірургічным аддзяленнам, пячаткі. Зрэшты, не ўсё так фігова. Ідэнтычныя маёй траўме мелі савецкі актор Анатоль Папанаў і амерыканская акторка Ума Турман.

Ці чакаў я Насцю? Ці хацеў, каб яна пабачыла мяне та-

кога – голага пад прасцінай, з перабінтаванай галавой і вартага жалю? Ды яшчэ з суседам па палаце – дзядзькам гадоў пад трыццаць, у якога не адно траўма галавы была, а зламаныя рэбры, рука і нага ў дадатак да бандажу на шыі (ён працаваў на будоўлі і навярнуўся з лясоў, у якіх трос адарваўся на вышыні чацвёртага паверху, добра, што не на голую зямлю ўпаў, а на пясок грудком)? Так, чакаў. Так, хацеў. Нягледзячы ні на што. Хаця асабліва губу не раскатваў. Хто мы адно аднаму? Выпадковыя мінакі. Калі б дзяўчына не прайшла міма, ніколі б жыцці нашы не перасякліся, дый ці б працягнулася маё жыццё ўвогуле. А мо яна проста плод майго ўяўлення? Пабочны эфект пашкоджанага мозгу? Магло такое быць? Цалкам магчыма. Бо хто ў нашым кончаным свеце пры ясным розуме і светлай памяці прыпыніць свой бяссэнсавы шлях у нікуды, таропкі і засяроджаны, каб вылучыць хаця б некалькі хвілін уласнага бясцэннага існавання на незнаёмца, які, хутчэй за ўсё, апынецца няўдзячнай п'янай тварынай альбо ванючым вашывым бамжом? Я сам так лічыў. Абыякавасць у крыві кожнага, абы мяне не чапалі, няхай вакол хоць планавае вынішчэнне нацый, хоць канец свету. Хіба што анёлам не ўсё адно. Магчыма, Насця якраз з племені гэтых пярнатых? Але яна абяцала, што мы пабачымся. Узяла пропуск у Дом друку, каб дапамагчы з газетай. Пропуск на звычайнай паперы, без фотаздымку, з напісанымі шарыкавай асадкай прозвішчам ды ініцыяламі ўласніка пропуску. Яго асабліва не правяралі. Галоўнае, што зверху

мелася шапка з вялікімі тлустымі літарамі «Дом друку». Калі праходзіш праз прахадную, проста трымаеш пропуск у руцэ так, каб шапку было відаць, і ідзеш сабе далей. Я не сумняваўся ў Насцінай дапамозе, я сумняваўся ў сабе. Хто яна, а хто я? Зрэшты, ні я нічога не ведаў пра дзяўчыну, ні яна пра мяне, і лягчэй ад усведамлення апошняга не рабілася. Затое ведаў, дзе Насця жыве, так што, калі што, сам завітаю ў госці пасля выпіскі з бальніцы, каб хоць дзякуй сказаць.

Разважанні мае перарвалі нечаканыя госці з міліцыі (дактары мусілі паведамляць у органы пра ўсе выпадкі гвалтоўных пашкоджанняў пацыентаў, якія трапялі да іх тым або іншым чынам). Яны ўвайшлі ў палату ўтрох. Двое ў форме. Трэці, відаць, следчы, якому ні я, ні мая справа не падабаліся апрыёры і з'яўляліся звычайнай руцінай, нуднай і нікому непатрэбнай, у першую чаргу яму. Следчы выглядаў галівудскім прыгажуном, глянцавым, бы часопіс пра кіназорак, без аніводнай зморшчынкі на твары, падобным больш на маску, чым на твар. З верхняй кішэні на бліскучым цёмным пінжаку вытыркаўся трохкутнік насоўкі. У параўнанні з ім іншыя двое нагадвалі прыслугу. У адным з іх я пазнаў удзельніка майго збіцця. Ён наўрад ці пазнаў мяне, але пільна ўзіраўся ў мой твар з чорнай кінгаўскай імглой пад вачыма, асабліва пасля слоў следчага пра месца здарэння, у якім мяне збілі. На яго твары аддрукоўвалася кожная думка, змяняла адна адну, як сурдапераклад па меры прасоўвання маналогу следчага, адрасаванага да мяне. «Я знайду цябе. Я кожнага з

вас знайду», – пазіраў на яго я і абяцаў сам сябе. У якійсьці момант трансляцыя думак на твары міліцыянта прыпынілася, на ім засняжыла, як у тэлевізары пасля заканчэння ўсіх праграм. Гэта я сказаў следчаму, што нічога і нікога не памятаю. Скажаш праўду, і апынешся вінаватым. Яны хуткія на падобныя пертурбацыі. Следчы тады, незразумела, ці ўзрадаваны, ці раздасадаваны, пажадаў мне папраўляцца, а ён яшчэ зазірне на тыдні ў спадзеве, што я ўсё ж што-небудзь успомню. Доктар яму казаў, што частковая амнезія магчыма, трэба набрацца цярпення і пачакаць. Пра Насцю не ўзгадаў ні разу.

Яна прыйшла пасля абеду, бліжэй да вечара. Мне якраз вярнулі рэчы, прынеслі ў каробцы, куды перад аперацыяй склала медсястра з вачыма колеру лесу. Ну хоць не голы.

Спачатку ў дзверы палаты нясмела ціхутка пастукалі, потым дзверы прачыніліся і праз іх прашчамілася, нібы шырэй яны не адчыняліся, Насця. Спынілася на парозе, ружовавалосая, з коскамі-рожкамі, у ружовай памадзе на вуснах. Залыпала лялечнымі вейкамі над нябёсным блакітам вачэй.

Я так быў рады прыходу дзяўчыны, што невыносна захацелася кінуцца да яе і абняць, выказаўшы такім чынам сваю ўдзячнасць і магчымасць адчуць сапраўднае шчасце. Так, шчасце! Менавіта яго я адчуў ад прысутнасці ў палаце Насці. Я нават зрабіў крок насустрач, як высветлілася, уяўны, бо ляжаў на ложку паўзверх пасцелі (апрануць штаны і кашулю каштавала мне не абы якіх высілкаў) і не мог паварушыцца.

Ці мог, але не атрымлівалася, напэўна, пасля ўколаў, якія ўзялі пад кантроль мае рухі. Насця паспяшалася прамовіць, каб я не ўставаў, паклала на тумбачку каля ложка пакунак з пачастункам і прысела ў нагах. Я ўсміхаўся ёй, відаць, як ідыёт, бо ўласную ўсмешку, якая не сыходзіла з майго твару ўвесь час, пакуль Насця знаходзілася ў палаце, менавіта ідыёцкай і лічыў. Але дзяўчына ніяк яе не пракаментавала.

– Ну прывітанне, герой-любоўнік! – ветліва мовіла.

– Прывітанне, – ахвотна адгукнуўся я. – Чаму герой-любоўнік? – адразу спытаў, бо не зразумеў сэнсу пачутага.

– Чаму герой ці чаму любоўнік? – яшчэ больш заблытвала яна.

– Я не герой, – пацiснуў плячыма, – і тым больш не любоўнік.

– Чый не любоўнік? – відавочна пакеплівала з мяне Насця, а я працягваў усміхацца балван-балванам. – І чый не герой? – дадала.

– Твой не герой і не любоўнік, – выціснуў з сябе і зірнуў на суседа, што пасопваў у ложку насупраць. Цікава, прытвараўся ён, што спіць, ці ўслухоўваўся ў нашу з Насцяй размову?..

– Ну, гэта часова, – усміхнулася дзяўчына неяк загадкава і шматабяцяльна. Хаця, напэўна, мне гэта толькі падалося.

– У сэнсе? – туга даходзіла да мяне, што, зрэшты, даравальна, бо ЧМТ.

– У перспектыве, – падсунулася Насця бліжэй і чамусьці

пакратала мае вушы, якія тырчалі, бы лакатары. – Вушасты які! – адзначыла, але не здзекліва, а неяк задуменна. – Ці ты супраць? – зноў нечакана агаломшыла пытаннем.

– Я? – перапытаў.

– Не, я, – выдыхнула паветра ўбок дзяўчына, быццам дым пасля зацяжкі цыгарэтай. – Рада бачыць цябе, кажу, у добрым здравіі. На вось, – палезла ў сумачку, дастала пропуск у Дом друку і працягнула мне, – гэта тваё. Газету занесла, у рэдакцыю патэлефанавала, паведаміла пра цябе, – адчыталася. – Супрацоўнікі табе спачуваюць і жадаюць хутчэйшага адужвання і вяртання ў калектыў. – Памаўчала і дадала: – Я таксама.

– Ты – цуд, – інакшых словаў, каб аддзячыць, не знайшоў.

– Я ведаю, – задаволена ўсміхнулася дзяўчына. Затым твар яе спахмурнеў і яна сказала паўшэптам: – Тут чуткі да мяне дайшлі, што ў цябе было сэрца спынілася. Што бачыў, не падзелішся?

– Ды нічога, – неахвотна адказаў я, бо сапраўды нічога не бачыў, а мо проста не памятаў.

– Зусім нічога? Ніякіх тунэляў ці белага святла?.. – не верыла Насця.

– Не, – расчароўваў я яе на роўным месцы. – Хаця, – трэба было нечым здзівіць дзяўчыну і я вырашыў здзівіць, – штосьці альбо кагосьці, хутчэй, бачыў.

Сказаў і замоўк. Нагнятаў паўзу і нецярпенне пачуць працяг.

– Ну і каго… Бога? – зрабіла Насця спробу ўгадаць.

– Не, – адказаў я адмоўна, – лепш.

– І каго ж?

– Цябе.

– Мяне?! – не паверыла Насця, але ёй, напэўна, хацелася, паверыць у тое, што я казаў. – І што я рабіла?

– Клікала мяне за сабой.

– Праўда?

– Праўда. І яшчэ рукой махала, каб паказаць шлях, куды мне рухацца, каб не застацца там, дзе цябе няма.

– Гэта… я… магу, – мовіла Насця марудна праз інтэрвалы. А затым выпаліла: – Ды хлусіш ты ўсё! У вас, журналістаў, у крыві хлусіць.

– Я не журналіст, – рашуча запярэчыў.

– А хто ж тады?

– Паэт.

– Хто?

– Вершы пішу.

– Тады тым больш.

Узнікла нялоўкая паўза, бы прусак прабег паміж намі.

– Але добра, што ты вершы пішаш, – прамовіла затым дзяўчына. – Пачытаеш?

– Цяпер? – спалохаўся чагосьці я.

– Не, не цяпер, – адмовіла Насця і з заклапочаным выглядам зірнула на гадзіннік. – Цяпер мне трэба па справах. Але іншым разам абавязкова! – абнадзеіла.

– Ты яшчэ прыйдзеш? – дакрануўся я да яе далоні з замерлым сэрцам.

– Ну канешне! – супакоіла дзяўчына. – Нават не сумнявайся!

Яна паднялася з ложка, наблізілася да мяне ўсутыч, нахілілася і пацалавала ў губы, доўга і соладка.

– Гэта каб ты не сумняваўся, – патлумачыла пасля. – Лопай пакуль вітаміны. І да сустрэчы!

Насця наблізілася да дзвярэй, падміргнула, як піратка, і сышла, а ў маёй галаве адразу ж успыхнулі вогнішчам рыфмаваныя словы:

*Дыягназ кахання паставіла восень*
*Пячаткаю вуснаў на аркушы зносін:*
*Дэфект спаткання на свежае ране*
*Адкрытага пералому кахання.*

У поліэтыленавым пакунку з абліччам Курта Кабэйна па баках, прынесеным Насцяй, я выявіў гронку бананаў, пяць вялікіх насычаных чырванню яблыкаў, якіх з'есці, здавалася, тое самае, што ўчыніць злачынства, бо выглядалі яны як шэдэўры сусветнага мастацтва, і літровую каробку апельсінавага соку. З бананамі адбылася цэлая гісторыя ці, лепш, спецаперацыя. Калі б не сусед, які са свайго ложка ва ўсе вочы пазіраў на гасцінцы, што я выклаў з пакунку на тумбачку, напэўна, шляхам памылак і спроб я б неяк зладзіў з экзатычнымі фруктамі: разабраўся б пакрысе, якім чынам іх ядуць. Зразумела, я ведаў, што такое бананы, але ніколі ра-

ней блізка з імі не сутыкаўся, тым больш не каштаваў. А выглядаць ідыётам у вачах суседа, як баяры Пятроўскіх часоў, калі ён прывёз з-за мяжы ў Расію бульбу, і тыя елі яе сырую ды неачышчаную ад шалупіння, не хацелася. Я прапанаваў суседу пачаставацца і працягнуў гронку з бананамі. Ён ахвотна адламаў адзін з іх, самы вялікі, заціснуў паміж ног і здаровай рукой спрытна распячатаў плод, бы абабраў кукурузу. Усё ж ідыётам пабыць я паспеў, бо, паўтараючы за суседам, упэўнены, што ўсё раблю правільна, таксама заціснуў адзін з бананаў паміж ног. Сусед рагатаў гэдак, што ледзь паўторна не зламаў шыю пад бандажом. Спачатку я пакрыўдзіўся на яго смех, мяне нават кінула ў чырвань, як рака ў кіпені, аднак у выніку рассмяяўся таксама. Сам жа вінаваты. Лепш бы запытаў проста, язык не адняўся б.

Ён пасля пакепліваў з мяне. Распавёў пра здарэнне жонцы, якая наведвала яго штодня. Яна не смяялася, усміхалася куткамі вуснаў, з-за чаго на шчоках гарэзавалі ямачкі, азараючы яе твар незямным святлом. Здавалася, перажывала яна за мужа больш, чым ён за сябе, уздыхала цяжка, праўда, так, каб ён не пачуў. Прыносіла больш хатняй ежы, баршчы ў судках, катлеты. Што з ім потым сталася, я не ведаў. Наступным днём мяне перавялі ў агульную палату, бо загойвалася ўсё як на сабаку (малады здаровы арганізм, бла-бла-бла, ніводнага сур’ёзнага пашкоджання ўнутраных ворганаў і ўсе косткі цэлыя: біць не ўмееце, рахіты. А за дзірку ў галаве адкажаце! Памяць у мяне фатаграфічная, таму я памятаў твар

кожнага), і больш яго не бачыў.

Апынуўся я ў палаце на восем чалавек. У ва ўсіх чмт, усе як партызаны з перабінтаванымі галовамі, у некаторых складаныя пераломы рук ці ног. Зрэшты, нейрахірургічны паверх, калі пройдзеш ім уздоўж і ўпоперак, чым я скарыстаўся адразу ж, каб размяць ногі, цалкам складаўся з падобных бедалаг, улічваючы некалькі жаночых палат.

Праваруч ад майго ложка, пад акном, ляжаў вахцёр Купалаўскага тэатра, хударлявы паважанага веку стары, якога збілі гопнікі на бязлюднай чыгуначнай станцыі Гай, калі ён чакаў апошнюю электрычку, каб вярнуцца з лецішча ў Мінск. Папрасілі закурыць па кананічным законе імбецылаў, далей па сцэнару, таксама ўсім вядомым. Забралі грошы, прадукты, параілі хутчэй здохнуць, бо да старасці жыць – сябе не паважаць. Ён не разумеў, чаму так сталася, за што яго збілі, бо ніколі за ўсё жыццё не сутыкаўся з гвалтам у свой бок. А тут падлеткі… Сілу няма куды дзяваць, дык выпрабоўвайце яе на сабе падобных… Ён распавядаў пра тэатр, актораў з такой далікатнасцю, нібы тыя з’яўляліся недатыкальнымі небажыхарамі і нагадваў мне чамусьці, чым больш распавядаў, дварэцкага ў заможным арыстакратычным катэджы дзе-небудзь на поўдні ЗША.

Леваруч суседнічаў з кіроўцам маршрутнага аўтобуса з Серабранкі ў Малінаўку і назад, прычым па дарозе абʼязджаў яшчэ купу мясцін, уключаючы Трактарны. Ён быў, што называецца, свой хлопец, душа кампаніі і ўлюбёнец дзяўчат.

Яны бегалі за ім табунамі. І ён не маніў. На свае вочы бачыў, як да яго штодня прыходзілі дзяўчаты, увесь час розныя. З-за адной з іх і перакуліўся апошнім рэйсам перад тым, як трапіць у бальніцу. Думаў, хоць тут адпачне ад залішняй жаночай увагі, ды дзе там.. Але відавочна яна, увага жаночая, яму падабалася. І да кожнай жанчыны ён знаходзіў патрэбныя словы, і кожную ашчасліўліваў. Гэтаксама часта, як дзяўчаты, да яго прыходзілі міліцыянты. Усё марылі зрабіць вінаватым у наўмыснай шкодзе дзяржаўнай маёмасці. Ён нічога не падпісваў і адмаўляў сваю віну катэгарычна. «Хай паходзяць, – казаў, – ім карысна». Менавіта ён пасля абеду наступнага дня паведаміў, што гэтым разам міліцыянты да мяне. Яго нават падкідала ад узрушэння, што міліцыя цікавіцца не адно ім.

Следчы прыйшоў адзін, без аховы. Такі ж прыгожы, упэўнены ў сабе валадар свету і сваёй правасці, з чорнай тэчкай пад пахай. Прапанаваў спусціцца ўніз у фае, бо мне ўжо было можна, каб без лішніх вушэй абмеркаваць нашу агульную справу.

Фае, прасторнае і вялікае, як ладная спартовая зала, сустрэла нас халоднай абыякавасцю. З большай цікавасцю, але, думаю, не на шмат, яно пазірала ў шкляныя сцены з уваходныміараднымі дзвярыма, што аддзялялі яго ад вулічных шумоў і руху. Пад шклом на адмыслова пастаўленых тады крэслах варушыліся нешматлікія наведнікі ды тыя, да каго яны прыйшлі. Леваруч ад уваходных дзвярэй і ўсутыч да

супрацьлеглай сцяны месцаваліся некалькі шапікаў, у якіх прадавалі фрукты, сокі, печыва, слодычы, беляшы і чабурэкі, а таксама кнігі з латка. Праваруч ад уваходных дзвярэй на сцяне збоку віселі таксафоны, якія займалі яе амаль усю. Шапік белдруку, адзінае месца, дзе можна было набыць тэлефонную картку, каб праз яе скарыстацца гэтымі таксафонамі, знаходзіўся за межамі бальніцы на тэрыторыі транспартнага прыпынку, на якім таксама гандлявалі фруктамі і гароднінай.

Мы паселі ў крэслы паміж дзвярыма і таксафонамі. Акрамя нас нікога больш у выбраным для размовы следчым крыле не назіралася.

– Паслухай, – пачаў ён, – твая справа вісяк, разумееш? – і з надзеяй, што я ўсё разумею і пайду яму насустрач, утаропіўся ў мой твар.

– Не, – катэгарычна адмовіў я. Не са зла, натуральна, бо сапраўды не разумеў, хоць следчы, па сутнасці, меў рацыю.

– Ты ж не помніш нічога, – нагадаў ён.

– Хто вам сказаў? – абурыўся я шчыра.

– Ты ж і сказаў, – ухмыльнуўся нядобра следчы.

– Праўда?

– Крыўда. Не прыдурвайся, – асадзіў. – Дык помніш ці не? – запытаў.

– Помню, – прызнаўся я.

– Дык чаму не сказаў нічога, калі першы раз я прыходзіў? – незалюбіў следчы.

– Не мог, – адказаў я.

– І чаму ж ты не мог? – цярпенне следчага відавочна трымалася на валаску.

– Бо адзін з тых, хто мяне збіў, прыйшоў разам з вамі, – вырашыў я чамусьці раптам, была – не была, распавесці як ёсць.

– Прыдумваеш па ходзе? – не паверыў мой суразмоўца.

– Вось таму і сказаў, што нічога на помню, – буркнуў я тады.

– Значыць, збілі цябе супрацоўнікі міліцыі? – перавёў дыханне следчы.

– Значыць, – кіўнуў я.

– За што?

– Здагадайцеся з трох разоў.

– Не наглей, – асадзіў мяне следчы. – Я пытанне задаў.

– Ні за што.

– Так не бывае.

– Бывае. Я кожнага з іх запамятаў на ўсё жыццё.

– Ну, дапусцім, твая праўда, – раптам перамяніў стыль размовы следчы. – Твае дзеянні? Пісаць заяву будзеш на іх? Дапусцім, напісаў, – адказаў за мяне і працягваў далей: – Дапусцім, апазнаў, распачалося следства. Ведаеш, чым яно скончыцца? Цябе пасадзяць, а яны апынуцца ахвярамі, якім ты ж яшчэ будзеш выплочваць кампенсацыю за маральную шкоду і паклёп на супрацоўнікаў органаў пры выкананні. А ведаеш, чаму менавіта так усё і адбудзецца? Таму што ты

ніхто, зваць цябе ніяк і закрыць цябе прасцей, чым разбірацца ды шукаць ісціну там, дзе яна нікому непатрэбна. Да таго ж твае крыўднікі столькі пра цябе насачыняюць на судзе, што пасля ніколі не адмыешся, калі ўвогуле выйдзеш на волю.

– Таму я і не помню нічога, – падсумаваў я яго тыраду.

– Давядзецца ўспомніць, – дастаў з тэчкі следчы аркуш паперы з загадзя напісаным тэкстам на ім. – Азнаёмся і распішыся, – працягнуў мне.

Мне прапаноўвалася падпісацца пад тым, што я ўпаў і ўдарыўся аб камень. Нават смешна стала. Гэта аб які ж мне трэба было ўдарыцца камень ды яшчэ так удала ўпасці, каб прадзіравіць галаву, ушчэнт раструшчыць костку ў чэрапе ды безліч гематомаў абрысці на целе!..

– Правяраць ніхто не будзе, – мовіў следчы. – Ты падпісваеш, справа закрыта. Ты спіш спакойна, і нам добра.

– І ордэн вам за паспяхова раскрытае… – крыва ўсміхнуўся я.

– Ордэн не ордэн, адным галаўным болем менш, – неяк асуджана ўздыхнуў следчы.

– Дык ішлі б з ментоўкі, каб галава не балела, – прабурчэў я.

– Куды? – чамусьці ўхапіўся ён за мае словы.

– З вашай знешнасцю. У кіно, – адказаў я на поўным сур'ёзе і падпісаў яго ліпу.

Праз колькі часу аднойчы я пазнаў свайго следчага ў ад-

ным з персанажаў ментоўскага серыялу, на які выпадкова патрапіў па НТБ. Ён граў вядучую ролю, як потым высветлілася. Курсіраваў з серыяла ў серыял, прычым граў адмоўныя ролі, не міліцыянтаў. Чувак рэальна сышоў з міліцыі, паехаў у Маскву, паступіў вучыцца акторскай прафесіі, ды не абы куды, а ў школу-студыю МХТ, і ніводнага разу не пазначыў нідзе, не агучыў у біяграфічных дадзеных сваёй датычнасці да беларускай міліцыі ў мінулым. Былыя саслужыўцы яго, напэўна, зайздросцяць па-чорнаму і ціха ненавідзяць. Зрэшты, падобнага кшталту эпізоды ў жыцці актора толькі на карысць. Вунь Ігар Пятрэнка паўтары года пад следствам, яшчэ столькі ж у псіхушцы, а затым яшчэ восем гадоў умоўна атрымаў за групавое забойства па малалетцы. Гэта ж Кландайк для фанатаў і журналістаў, дый для самога актора, каб «не зарасла народная трапа» раней часу.

Следчы сышоў. Я пазіраў яму ў спіну праз шкло аконнай сцяны, бы ўслед караблю, які знікаў у бязмежнай прасторы акіяну, у бязмежнай прасторы кастрычніцкай восені, што не паўторыцца ніколі і, тым не менш, абавязкова паўторыцца, бо яе нязменнасць, надыход і сыход у некім сплsecurityаваны і акрэслены тэрмін – непазбежная дадзенасць, у якой толькі мы выпадковыя пасажыры. Яна ні каліва не стане напружвацца, каб хаця б запомніць нашы імёны. Бо навошта? У адрозненне ад яе, зрэшты, як і астатніх пор года, якія заўжды ўваскрасаюць птушкамі фенікс, дэкларуючы пра неўміручасць, чалавек падобным пахваліцца не можа. Яго сы-

ход канчатковы і абскарджанню не падлягае. Таму і напружвацца, каб некага запомніць, не мае сэнсу, праўда, восень? Цякучка жыццяў навокал для яе, напэўна, атаясамлівалася з цякучкай кадраў на якім-небудзь буйным прадпрыемстве ці на вайне.

Але жыццё працягвалася, як бы легкадумна я да яго не адносіўся б. Чаму легкадумна? У 19 гадоў, што б з табой не здарылася, у смерць як такую паверыць было цяжка, хутчэй як у гульню. Альбо ўвогуле ігнараваць яе прысутнасць бы зачмыранага задрота ў школе на «камчатцы» (у кожным класе, не сумняюся, падобныя бедалагі меліся). Натуральна, смерць не бедалага, аднак пераканаўчыя малюнкі шматлікіх мастакоў у адваротным не пакідалі ёй аніводнага шансу на паразуменне. Чаму я ўзгадаў пра яе? Напэўна, з-за жыцця, да якога яна вечна чаплялася як пабірушка. Жыццё ж усміхалася ва ўсе 32 і клікала на піва, якому я аддаваў перавагу ў кампаніі сяброў, а сябры каторы дзень нічога пра мяне не ведалі і ламалі галовы, куды я падзеўся. У кішэні скуранкі засталіся тэлефонная картка і невялікі нататнік, куды я запісваў не адно вершы, але і тэлефонныя нумары, да прыкладу, рэдакцыі часопіса «Першацвет». Менавіта праз «Першацвет» і можна было нагадаць пра сябе. Куртка знаходзілася ў гардэробнай (верхняе адзенне з астатнімі рэчамі не вярталі) для пацыентаў, куды я і накіраваўся. Пасля таго, як мне выдалі скуранку, накінуў яе на плечы, намацаў адно пачаты пачак цыгарэт і адчуў нясцерпнае жаданне курыць. Выйшаў на вуліцу,

закурыў. Першая ж зацяжка ледзь не паваліла з ног, хітнула так, быццам апынуўся на борце рыбацкай шхуны ў шторм. Другая прыціснула да сцяны, бо інакш бы дакладна паваліўся. «Ты ж сяброўка мая, – звярнуўся я да цыгарэты, – што ты робіш? Не хочаш сябраваць, так і скажы». На трэцюю зацяжку ўжо рашыцца не рызыкнуў, кінуў цыгарэту ў сметніцу і вярнуўся ў фае па сценцы. Прысеў перадыхнуць. Наўрodзе стала лягчэй. Тады рушыў да таксафонаў, спыніўся побач з адным і затэлефанаваў у «Першацвет». Слухаўку падняў Алесь Герасімавіч Масарэнка (галоўны рэдактар часопіса і старшыня літаб'яднання пры ім, дзе па панядзелках збіраліся маладыя айчынныя творцы, пра якіх мала хто ведаў і мала хто адносіўся сур'ёзна з-за іх, натуральна, маладосці, што, тым не менш, нікога з моладзі не бянтэжыла), каму ж яшчэ, бо менавіта ён сядзеў заўжды побач з тэлефонам. Яму я і распавёў пра месца свайго знаходжання ды папрасіў, каб пры нагодзе інфармацыя гэтая трапіла да маіх сяброў, больш за тое, братоў па крыві Янкі Лайкова і Паўла Гаспадыніча.

З Янкам мы пазнаёміліся ў яго на радзіме, калі паэтычным дэсантам з «Першацвету» прыязджалі на выступ у школу, дзе дырэктарам быў Янкаў бацька, які, між іншым, стварыў на базе школы ўнікальны літаратурны музей, а з Паўлам у адзін з панядзелкаў напрыканцы лета. Замацавалі ж сяброўства некалькімі «Вермутамі» на канцэрце «Рок супраць СНІДу», што адбыўся напачатку верасня ў Парку Чалюскінцаў. Ну а пабраталіся ў кватэры вялікага беларускага па-

эта Анатоля Сыса, гасцямі якога бывалі нярэдка. Пакуль Сыс гатаваў юшку на кухні, мы ў адзіным пакоі кватэры паэта і вырашылі паклясца на крыві ў вечным братэрстве як тыя мушкецёры. У мяне з сабой якраз аказаўся нож (знайшоў неяк на вуліцы ды цягаў увесь час з сабой на нейкую трасцу, вось і прыгадзіўся), які нажом, шчыра кажучы, цяжка было назваць. Вастрыё у ім адсутнічала цалкам, абодва бакі ляза ўяўлялі ўзгоркі, 20 узгоркаў з аднаго боку, 20 з другога. Вось гэтымі ўзгоркамі мы раскалупалі свае далоні і лініі, па якіх тыя праходзілі, выпацкаліся ў крыві і змяшалі тую кроў паміж сабой дотыкамі далоняў адна да адной. Сыс, калі пабачыў, што мы нарабілі, ахрысціў нас прыдуркамі, пагнаў, як бараноў, у ванны пакой, але шчаслівейшых людзей на зямлі, напэўна, у той момант не існавала. Таму і не дзіўна, што менавіта на кніжцы Сыса «Пан Лес» Янка, даведаўшыся пра маё знаходжанне ў бальніцы, запіша нумар тэлефону нейрахірургічнага адзялення 9-й бальніцы і нумар маёй палаты пасля тэлефанавання ў даведачную, на ўнутраным баку яе задняй вокладцы.

Насця не прыходзіла трэці дзень. Я сумаваў па ёй і злаваўся на яе з не меншай сілай, чым сумаваў. Мне не хапала прысутнасці дзяўчыны як паветра, ды, тым не менш, усё ж дыхаў. Дыхаў напоўніцу, прагна і з эгаістычным пачуццём уласнай вартасці ды значнасці насуперак словам следчага пра тое, што я ніхто і зваць мяне ніяк. Памыляецеся, «грамадзянін начальнік», так звычайна звярталіся ў фільмах да су-

працоўнікаў міліцыі прыніжаныя і пакрыўджаныя імі, мая асоба яшчэ як патрэбна гэтаму свету і гэтай краіне, за якую я, звычайна, паміраць не збіраюся, няхай яна лепш загіне за мяне, бо гэта я вялікі беларускі пісьменнік, няхай не цяпер, няхай у будучым, але абавязкова вялікі, калі не геніяльны. Таму называць мяне нікім недальнабачна. У якасці доказу пачытайце мае вершы. Крычаў бязгучна я ў прастору, якую замяняла столь над бальнічным ложкам у палаце, прапахлай болем, жалем да сябе ды нямытымі целамі з прысмакам затхласці, поту і начных кашмараў. Весялілі хіба што прусакі – вялікія, рудыя, нахабныя істоты, якія лічылі сябе гаспадарамі ў кожным памяшканні бальніцы. Звычайна на промысел яны выходзілі пасля адбою, калі ў палатах выключалася святло і хворыя, крэкчучы ды стогнучы, засыналі. Аднак не грэбавалі ці не баяліся і дзённага святла. Адвага іх, тым не менш, выглядала дурнаватай, асабліва калі яны статкам тапіліся ў неабачліва пакінутых адчыненымі каробках з сокам. Каробкі не закручваліся, у іх адразаліся носікі, якія, чым не затыкай, прусакі-камікадзэ ўсё адно ўмудраліся выкарыстаць у сваю карысць. Сок трэба было выпіваць альбо зараз, альбо пераліваць у посуд, які для прусакоў быў бы не па зубах. Сок, прынесены Насцяй, у якім прусакоў аказалася больш за ўласна сок, давялося выліць ва ўнітаз. Сквапнасць іх яскрава нагадвала чалавечую. А зранку, калі яшчэ цёмна і знянацку запаліць святло, можна было пабачыць на сценах цэлыя пазлы з прусакоў, якія, натуральна, па-

чыналі разбягацца ў розныя бакі, мітусіцца і нават падаць на падлогу з бязгучным крыкам аб паратунку ці, наадварот, незадаволенасці. Каб неяк разбавіць час і разняволіцца – мы лавілі некаторых і наладжвалі спаборніцтвы паміж прусакамі на доўгія і кароткія дыстанцыі. У падобных забаўкаў палата ўдзельнічала поўным складам. Але ўсё адно нічога не ратавала ад нуды і жарсці па Насці. Магчыма, таму, я так узрадаваўся, калі ў палату зайшлі Янка з Паўлам – роднасныя душы. Яны спачатку спачувальна пазіралі на мяне, хацелі дапамагчы, але чым і як не ведалі, і пачуваліся ніякавата, нават адчувалі віну, а за што, не разумелі самі. Я ўсміхаўся, маўляў, усё добра і добра, што вы прыйшлі… ды запрапанаваў пайсці на піва.

– А можна табе? – засумняваўся Янка.

– Можна – не можна, няважна, – адказаў я. – І проста неабходна адзначыць маё другое нараджэнне, – дадаў. – Ці хтосьці супраць?

– Мікола не мяняецца, – падсумаваў Павел. – Нічому жыццё не вучыць.

– Наадварот, – прамовіў я, – многаму. А таму падняць пару келіхаў за жыццё гэта павага да яго.

Я выцягнуў з-пад матраца скуранку, якую не здаў у гардэроб і прыхаваў на ўсялякі выпадак, каб не звяртацца ўвесь час да абслугоўваючага персаналу ды не звяртаць тым самым да сябе ўвагу, і мы рушылі па подзвігі і прыгоды. Янка пазычыў сваю кепку, каб прыкрыць маю лысіну ды забінтаваную

галаву, што амаль не хавала бінты, але надавала значнасці галаве.

Пад піва, якое мы пілі ў нейкім скверы паблізу бальніцы, і курыць атрымалася. Цыгарэты не намагаліся збіць мяне з ног і ўцячы як нявесты з загсу. Наадварот, аддана і з любоўю ахутвалі дымам.

Мы чыталі вершы. Кожны свае. Напісаныя за той час, у які не бачыліся. Пілі піва, курылі і чыталі вершы, а пасля іх абмяркоўвалі. Бледнае анарэксічнае восеньскае сонца зверху няўцямна пазірала, але, не сумняюся, прыслухоўвалася да кожнага нашага слова, гэтаксама як вераб'і і галубы, што, быццам гледачы ў тэатральнай зале, паселі вакол нас і ўдавалі сябе за ўдзячную аўдыторыю. Не ставала адно захопленых воплескаў. Мы так жылі. Мы жылі паэзіяй і не ўяўлялі сябе без яе, не сумняваючыся, што менавіта мы неўзабаве станем народнымі паэтамі Беларусі, як Янка Купала, Якуб Колас і Анатоль Сыс.

Чацвёрты дзень без Насці ламаў мяне як наркамана без дозы. Нават трэсла натуральным чынам, бы ў ліхаманцы, і падскочыла тэмпература. Кожны гук раздражняў і выклікаў непрыхаванаую нянавісць да яго носьбіту. Я ненавідзеў усіх насельнікаў палаты, бо да іх цэлы дзень ішлі ды ішлі наведнікі, шкадавалі, гаварылі прыгожыя словы, ахутвалі клопатам і цяплом. Дзверы стаміліся адчыняцца і зачыняцца, прапускаючы праз сябе нястрымную плынь людзей. Дзверы я ненавідзеў таксама, бо яны абслугоўвалі каго заўгодна, толь-

кі не мяне. Штораз, як яны адчыняліся, я сутаргава дзёргаўся ў спадзеве на з'яўленне Насці, але гэта заўсёды была не яна. Я паціху замярзаў на сваім ложку, апрануты і гатовы да сустрэчы з дзяўчынай у любы час, ды сустрэча, мабыць, аб'явіла мне чамусьці байкот ці палічыла мяне нявартай сябе, пайдзі разбяры, неўпрыкмет скруціўся абаранкам, падкурчыўшы пад жывот ногі, і заснуў, зморaны марным чаканнем.

Яна прыйшла пасля ціхай гадзіны ціхім шолахам. Я не пачуў яе, я не адчуў яе, ахоплены, а мо захоплены, бы ў палон, сном, трывожным і тварожным. Паклала на тумбачку авоську з яблыкамі і села побач. Не будзіла, глядзела на мяне і праводзіла далоняй зверху ўніз і знізу ўверх па маёй шчацэ ў дзьмухаўцовым пуху барады, якая паспела прарасці дзенідзе кусцікамі пасля галення перад аперацыяй. Так, барадой тое, што нарасло на твары, было цяжка пакуль назваць, і пры жаданні, напэўна, адным моцным подыхам здзьмухнуць не склала б асаблівых высілкаў увесь той пух, што ўзнік на шчоках, як, уласна, дзьмухавец. Насці, відаць, падабалася ці, хутчэй за ўсё, падобным чынам яна ўсё ж мяне будзіла. У якійсьці момант я расплюшчыў вочы і… не паверыў ім. Заплюшчыў зноў, бо падумаў, што ўжо галюцыянаваць пачаў. Расплюшчыў – Насця, гэтым разам з зялёнымі валасамі, што хвалямі струменіліся на плечы, і вельмі насычана акрэсленымі чорнай тушшу вачыма, нікуды не знікла.

– Насця! – узрадавана ўсклікнуў я, бы пабачыў Бога, ну

а калі не Бога, то дзеву Марыю дакладна.

– Тс-с! – прыклала ўказальны пальчык з чорным манікюрам на пазногці да сваіх вуснаў дзяўчына, бо на мой вокліч зрэагавала ўся палата, прычым не вельмі добра. Тады я саскочыў з ложка, схапіў Насцю за руку і рашуча пацягнуў за сабой прэч з палаты, а затым у накірунку да канца калідора, дзе сама па сабе існавала бакавая лесвіца, якою звычайна ніхто ніколі не карыстаўся, таму месца там было зацішнае і якраз нам падыходзіла, ну а калі не нам, то мне. Ведаць думкі Насці наперад на гэты конт я не мог, але яна не адставала, не ўпіралася і нічога не запытвала.

Я ледзь не ўпячатаў яе ў сцяну на лесвічным пралёце сваёй прэтэнзіяй, на якую, як лічыў, меў права.

– Дзе ты была? Чаму не прыходзіла так доўга? Што ў цябе за справы?..

Выгукваў проста ёй у твар.

Насця адштурхнула мяне ад сябе словамі:

– Так, стапэ! Ты нічога не паблытаў, хлопчык?! Ты хто мне, каб заяўляць падобнае?! І, самае галоўнае, хто табе я, га?!.

Яна мела рацыю. Яна сто разоў мела рацыю. Яна мільён разоў мела рацыю. Гэта мяне занесла, аб чым я адразу ж пашкадаваў. Параўнанне ж з хлопчыкам выклікала міжвольную ўсмешку, бо дзяўчына выглядала школьніцай, нягледзячы на ўвесь свой баявы раскрас. Пасля, натуральна, я даведаюся, што Насця была старэйшаю за мяне на тры гады.

А пакуль яна мяне сарамаціла:

– Я цябе бачу трэці раз у жыцці, як і ты мяне, на секундачку! Каб прад'яўляць мне штосьці ды яшчэ ў агрэсіўнай форме, малавата, не знаходзіш? Лепш бы ўдзячнасць праявіў, а не сапсаваў усё!..

Я адчуваў, што яшчэ крыху, і дзяўчына сыдзе, каб ужо не вярнуцца ніколі. Так, я ведаў, дзе яна жыве, аднак наўрад ці тое веданне мне дапаможа, каб яе вярнуць, калі яна проста зараз сыдзе.

Я мусіў выбачыцца перад Насцяй. Выбачыцца неадкладна. Але раптам адчуў такі дзікі пульсуючы боль у галаве, што не ведаў, куды ад яго падзецца. Здавалася, у маім чэрапе ажыў самы сапраўдны вулкан, які невядома адкуль узяўся, і штуршкамі выпіхваў лаву, гатовую вось-вось вывергнуцца праз дзірку разам з мазгамі і крывёй. Я пачаў наразаць кругі вакол дзяўчыны, ці мне гэта проста мірсцілася, бо яна нерухома стаяла ля сцяны, ахоўвала яе ад мяне і спалохана пазірала на тое, як я намагаўся садраць бінты з галавы і кулакамі загнаць лаву ў стойла, назад у вулкан, каб ён заткнуўся сваім жа вырабам, замоўк, знік, растварыўся на атамы…

Насця кінулася да мяне, абняла так, нібы хацела стаць мной, нібы хацела ўвесь той боль, што я адчуваў, пераманіць на сябе. І гладзіла па галаве.

– Цішэй, цішэй, я не хацела, – шаптала на вуха, – каб табе стала дрэнна. Прабач мяне, калі ласка!

Дзіўная справа, аднак шэпт яе, яе цяпло ўтаймавалі боль

да такой ступені, што я падумаў: аглох. Цішыня ўзнікла ідэальная. Праз якую чуўся кожны стук сэрца дзяўчыны ў маю грудзіну, быццам сэрца яе прасілася ў госці да майго. Я абняў яе таксама, прыціскаў з такой моцай, склаўшы рукі ў замок на яе спіне, што яна выдыхала паветра з міжвольным стогнам. Выдыхала проста мне ў твар, заплюшчыўшы вочы.

– Прабач, – загаварыў я тады, – прабач, я не хацеў, каб табе было дрэнна ці балюча.

– Мне не дрэнна, – расплюшчыла вочы дзяўчына. – І не балюча. Дрэнна табе.

– Ужо не, – запэўніў я. – Боль збег як прусак, адно пабачыў цябе.

– Я такая страшная? – сумна ўсміхнулася Насця.

– Наадварот. Дзівосная, – запярэчыў у адказ. – А боль і дзівосы рэчы несумяшчальныя, таму боль заўсёды пасуе перад дзівам, – дадаў.

– Прыгожа, – адзначыла з усмешкай Насця, – адразу бачна, што ты вершы пішаш, – адзначыла не без іроніі. – Але не рабі так больш.

– Як? – не зразумеў я.

– Не палохай мяне, – пазірала вочы ў вочы Насця. – Я ледзь стрымалася, каб не пабегчы па дапамогу за доктарам.

– Для мяне ты, як бачыш, найлепшы доктар, – мовіў я.

– Прыпыні, – не пагадзілася Насця, але ход маіх думак ёй спадабаўся. – Можа, на свежае паветра выйдзем? – прапанавала.

Чаму б не? У любым выпадку не перашкодзіць. Таму мы ўзяліся за рукі і спусціліся ўніз па лесвіцы. Выйшлі ў фае якраз там, дзе гандлявалі кнігамі, і вока маё асобна ад мяне, нібы нябачная рука, зачапілася за адну з кніг на латку. Насця ўважлівым позіркам назірала, як я ўзяў кнігу, як разгарнуў, як учытваўся ў анатацыю, а потым паклаў на месца. Навошта я ўвогуле спыніўся перад тым латком?.. Мабыць, спрацаваў умоўны рэфлекс: ён у мяне менавіта на кнігі спрацоўваў безадмоўна. Але ў той момант лепш бы ён не вытыркаўся.

– Колькі? – звярнулася Насця да гандляра – інтэлігентнага з выгляду, у акулярах, мужчыну сталага веку без двух пальцаў на адной руцэ. І я чамусьці падумаў, што ён з якудзы. Дакладна з якудзы, вунь і рысы твару ўсходняга паходжання. Толькі якудза адразаюць сабе пальцы за любую правіну. Гэты, відаць, збег, каб зусім без пальцаў не застацца, куды падалей з Японіі, апынуўся ў Беларусі… Гандляр назваў кошт кнігі на чыстай беларускай мове, што мяне яшчэ больш упэўніла, што ён з якудзы. Іншаземцы, як правіла, валодалі мовай лепей за карэнных беларусаў і ніколі не сароміліся размаўляць на ёй.

Насця адлічыла грошы і заплаціла за кнігу. Гандляр падзякаваў за набытак і пажадаў добрага дня ды прыемнага чытання, а яшчэ запрасіў заходзіць пры нагодзе іншым разам. Працягнула кнігу мне. Гэта быў «Альтыст Данілаў».

– Навошта ты? – ніякаваў я пад яе позіркам. – У мяне ёсць грошы.

– Справа не ў грашах, – адказала дзяўчына. – Гэта падарунак. На памяць. Пра мяне. Будзеш чытаць і бачыць мяне перад вачыма ў кожнай літары.

Вядома, з вялікай удзячнасцю я ўзяў падарунак, але словы, прамоўленыя Насцяй, насцярожылі, і я запытаў у яе:

– Ты ж не развітваешся такім чынам?

Яна абняла мяне.

– І не мар, – выдыхнула ў твар.

Мы зноў узяліся за рукі і выйшлі на вуліцу, якая сустрэла нас амаль летнім цяплом і парнасцю як перад дажджом, хоць неба не трансліравала ніводнага воблачка, вісела над галавой гіганцкай сто разоў памытай прасцінай, нерухомай і сумнай, падобнай на бальнічныя. Даволі навязлівае сонца – рэзкі кантраст з учарашнім – увесь час наравіла прылашчыцца, бы хатняя кошка, таму давялося збегчы ад яго ў цень і сесці на лаўку пад разгалістай старой таполяй. Сонца сапраўды невыносна сляпіла вочы і, парадокс, шукала цяпла пад пахамі людзей. Так, прынамсі, здавалася мне. Магчыма, яно прадчувала хуткі наступ халадоў з сезонам дажджоў.

– Ведаеш, – прамовіла Насця як толькі мы апынуліся на лаўцы, – чаму я не прайшла міма цябе, калі ты ляжаў пад алычой, такі безабаронны, такі адзінокі, у позе эмбрыёна?..

Мне здалося, у словах дзяўчыны хаваўся якійсьці падвох. Навошта яна раптам прыгадала тое, што я намагаўся забыць?..

– Навошта ты ўзгадала гэта менавіта цяпер? – перасмык-

нуў я плячыма, бо ад Насціных слоў чамусьці стала знобка.

– Табе непрыемна? – зірнула яна на мяне ўважліва і адначасова быццам праз мяне.

– Прыемнага мала, – адгукнуўся я.

– Разумею, – пагадзілася дзяўчына, – але мушу давесці сваю думку да лагічнага завяршэння, – настойліва вымавіла.

Я напружыўся ў прадчуванні чагосьці нядобрага.

– Не бойся, – заўважыла Насця мой стан, – нічога кепскага пра цябе я не скажу, наадварот. – Яна памаўчала, быццам збіралася з духам, затым загаварыла зноў, а я ўслухоўваўся ў яе голас, як пёс, якога хвалілі за нешта, але ўсё адно ён не разумеў, за што. – Мяне ўразілі твае вочы. У іх было столькі болю і пакуты, але, тым не менш, выпраменьвалі яны дабро. Ад святла ліхтара, што лілося зверху, свячэнне тваіх вачэй было настолькі насычаным і прыметным, што, здавалася, яго можна было пакратаць навобмацак. Твае вочы пахлі дабрынёй, ёю ж пахнуць і цяпер, – падсумавала яна.

– І хто з нас лепшы паэт?.. – азваўся я.

– Я не прэтэндую, – адказала Насця. – Тым больш да паэзіі не маю ніякага дачынення і не хачу мець. Павер, у большасці мужчын, у пагалоўнай большасці вочы смярдзяць, я ў гэтым больш-менш разбіраюся. Твае вочы не смярдзелі…

– Значыць, калі б смярдзелі мае вочы, – ты б прайшла міма? – падумаў я ўголас.

– Калі б твае вочы смярдзелі, – запярэчыла Насця, – ты б ніколі не трапіў пад тую алычу, ну а вершы дакладна б не пі-

саў.

– Цікава-цікава, – прабубніў я сабе пад нос.

– І таму я з табой, – выдыхнула дзяўчына, але ў той жа момант паглядзела на гадзіннік. Зноў у яе нейкія справы! Не паспела прыйсці – як ужо час некуды сыходзіць! Прыкметна занервавала.

– І таму табе зноў некуды трэба, – не стрымаўся яе ўпікнуць.

– Ты чытаеш мае думкі, – усміхнулася Насця.

– Куды ты ўвесь час знікаеш? – патрабаваў я адказу. – Чаму штораз у розных вобразах прыходзіш, бы на маскарад?.. Што?…

Дзяўчына прытуліла свой указальны пальчык да маіх губ, маўляў, заткні пэльку.

– Гэта… – задумалася, магчыма, над адказам, і з задумлівым выглядам мовіла: – Гэта не мая тайна, Драцянян.

– Хто? – расплыўся ва ўсмешцы мой твар.

– Ну, Драцянян, тры мушкецёры, Канстанцыя Банасье… Не чытаў? – узіралася ў мой твар Насця і шчыра не разумела маёй весялосці. – Што смешнага я сказала?

– Мо д’Артаньян усё ж, – паправіў яе.

– Д’Арт… пакуль вымавіш, званітуе, – непрыгожа скрывіла твар Насця. – Імем, канешне, Бог узнагародзіў чалавека яшчэ тым…

– Гэта прозвішча, – удакладніў я.

– Тым больш. Карацей, усяму свой час, дамовіліся?

– У мяне ёсць выбар?

– Выбар ёсць заўжды, герой-любоўнік.

Насця паднялася з лаўкі. Я ўскочыў следам за ёй, прытрымаў за руку. Яна наблізілася ўсутыч, прыхінулася, абвіла маю шыю рукамі і ўзнагародзіла замест тлумачэнняў доўгім жарсным пацалункам, ад якога я ледзь не паваліўся, бо закружылася галава. Што ж я за рахіт такі: ад усяго хістае як дзьмухавец?..

Дзяўчына пацерлася пасля пацалунку сваім носікам аб мой, пацалавала яшчэ па чарзе мае вочы, сказала, што ёй сапраўды пара, але мы абавязкова неўзабаве сустрэнемся, і пайшла. Пайшла ў нікуды.

– Насця! – аклікнуў я яе.

Яна спынілася. Азірнулася з пытаннем:

– Што?

Але не знерваваным ці незадаволеным. Пытанне дзяўчыны прагучала так, нібы яна чакала, каб я аклікнуў яе. Ці мне падалося?

Я імкліва падышоў да яе, моцна прытуліў і пацалаваў. Вочы яе былі прыемна здзіўленымі.

– Я цябе забяру, калі выпішышся, – раптам паабяцала.

– Куды? – машынальна запытаў я і сам жа адказаў за дзяўчыну: – Гэта не мая тайна, Драцянян, так?

– Люблю цябе, – прашаптала Насця і паспяшалася па сваіх таямнічых і важных справах. А я… я проста закурыў, яшчэ не асэнсаваўшы як след тое, што дзяўчына мне прашаптала.

На чарговай перавязцы з мяне знялі бінты і больш імі не абцяжарвалі галавы. Апрацавалі нечым халодным, папырскалі на рану, рыхтык у цырульні, сказалі, што, хутчэй за ўсё, праз тыдзень выпішуць, як толькі праколюць стандартны набор уколаў. Я вярнуўся ў палату, уладкаваўся на ложку з кнігай, падоранай Насцяй, аднак не чыталася. Як і прадбачыла дзяўчына, замест літар перад вачыма ўвесь час мільгаў яе твар, падміргваў, усміхаўся, абяцаў нешта салодкае і смачнае, пра што я нават баяўся думаць, але сны тыя думкі бессаромна ажыццяўлялі. Чым мы толькі з Насцяй не займаліся ў маіх снах! Калі б распавёў ёй – адназначна адгроб напоўніцу б. Ну, па-першае, рабавалі банкі па прыкладу Бонні і Клайда, адно што замест машыны ў якасці сродку перасоўвання выкарыстоўвалі матацыкл, якім Насця нядрэнна кіравала. Ніводная міліцэйская машына не магла дагнаць нас. Насця так любіла хуткасць, а хуткасць – яе, што пагоня апрыёры не мела ніякага сэнсу. Да таго ж, у выпадку блакавання дарогі, матацыкл узлятаў і праносіўся панад міліцыянтамі (такімі смешнымі з міжвольна задранымі ўгару галовамі) віхурай ды імчаў сабе далей, пакідаючы перасреднікаў закатанымі ў пыл, бы ў дыван. Па-другое, даследавалі закінуты і занядбаны востраў пасярод акіяну без аніякага следу людзей і цывілізацыі. Вучыліся мове птушак і звяроў. Асабліва пасябравалі з ільвамі, ваўкамі ды малпамі. Па-трэцяе, апынуліся на нейкую трасцу ў кратэры Марса, з якога ледзьве выбраліся на безжыццёвую чырвоную паверхню планеты ды

ўцякалі ад туземцаў, але не ўцяклі. Зрэшты, нічога страшнага з намі потым не адбылося, бо нас прынялі за багоў і пакланяліся з вялікай пачцівасцю. Не, усё ж страшнае затым магло б адбыцца. Нас бы з’елі, як з’елі Кука, калі б я не прачнуўся. Па-чацвёртае, Насця раптам апыналася Канстанцыяй Банасье, а я Драцянянам, менавіта Драцянянам і нікім іншым, ды ратаваў яе ад гвардзейцаў кардынала і Міледзі, нейкім дзівам апынуўшыся ў савецкім фільме пра трох мушкецёраў. Чаму, дарэчы, трох, калі іх было чацвёра? Аўтар лічыць не ўмеў? Ці проста «Чатыры мушкецёры» не гучыць гэдак, як «Тры мушкецёры»? Смешна было назіраць за гвардзейцамі і Міледзі, якія супрацьстаялі не адно Баярскаму і Алфёравай, але яшчэ і нам з Насцяй, улічваючы той факт, што Атос, Партос і Араміс заставаліся нязменнымі. А вы што падумалі? Напэўна, разлічвалі на эратычныя падрабязнасці, хаця б у сне, з дэталёвымі апісаннямі любоўных уцех? Я б таксама не супраць такіх падрабязнасцяў, але да падобных глупстваў у той перыяд жыцця мозг мой, відаць, яшчэ гатовы не быў. Адурманены сентыментальна-рамантычным чытвом, якім я не шкадуючы пічкаў яго, мозг нічога іншага і не мог мне прапанаваць, тым больш пашкоджаны, бы камп’ютарная праграма. Зрэшты, не чыталася яшчэ і таму, што рука мая цягнулася і цягнулася, муляла яе нясцерпна, да раны на галаве, каб мацаць яе, кранаць, зноў мацаць і так да бясконцасці. Да таго ж яна часалася. Пад бінтамі не так адчувальна, а без бінтоў… хоць рукі бяры ды адсякай і станавіся

як дрэвы, што нерухомымі помнікамі самім сабе стаялі ўздоўж праспекта з адсечанымі зверху данізу галінамі. Іх яшчэ, быццам магілкі, памясцілі кожнае ў асобную аградку ды пафарбавалі яе ў чырвона-зялёныя колеры.

Увагнутасць пад рукой уяўлялася ўвагнутасцю ў яйку. Прынамсі навобмацак. Зрэшты, па вялікім рахунку, параўнанне амаль дакладнае. Альбо більярдны шар з адбітым кавалачкам. Таксама нядрэннае параўнанне. Пра наступствы, якія пагражалі ў будучым майму здароўю, я не задумваўся. Наадварот, хацеў хутчэй выпісацца і сустрэцца з Насцяй на прасторах, як пісаў класік, жыцця. Будучыня мяне не палохала, бо мяне любілі. Я не памыліўся, калі пачуў Насціны словы пра любоў. Я чуў іх дакладна. Яны мне не прымроіліся, не пачуліся, бо хацелі пачуцца. Я іх не прыдумаў. Насця выразна прамовіла іх сваім кіношным, так, менавіта кіношным голасам, сваімі вуснамі, якімі да гэтага цалавала мяне, салодкімі і гарачымі, як гарачы шакалад. А я ўтрэскаўся ў яе з першага позірку па самыя вушы, па самыя мае вушастыя вушы, якіх саромеўся ўсю дарогу і хаваў пад доўгімі валасамі, з-за чаго паходзіў на дзяўчынку і з дзяўчынкай мяне часта блыталі, асабліва ў дзяцінстве.

Яна мне патэлефанавала. У бальніцу. На дзяжурны пост, які знаходзіўся акурат насупраць маёй палаты. А другой гадзіне ночы. Дзіўна? Яшчэ як. Неверагодна? Але факт.

Пасля адбою я хутка заснуў, ды прачнуўся а палове другой ночы. Зноў заснуць не атрымлівалася, бо ў сне я склаў верш,

прысвечаны Насці, які нават паспеў назваць «Калыханка для каханай». Каб не забыць, яго неадкладна патрабавалася запісаць, бо на памяць асабліва спадзявацца не выпадала. Вось жа парадокс, я мог запомніць і памятаць ці не ўсё жыццё тавары, назвы вуліц і гістарычныя даты, але ніводнага свайго верша, напісанага ўласнаручна, не памятаў. Іх, каб дзе-небудзь урачыста прачытаць з гонарам узіраючыся ў вочы слухачоў і гледачоў, а не ў паперку ў трымтлівай руцэ, даводзілася завучваць, як у школе. У падобныя моманты шчыра зайздросціў Ясеніну, які памятаў кожны напісаны ім верш.

Радкі, складзеныя ў сне, я паўтараў адзін за адным, але адчуваў: калі засну – абавязкова забуду і зранку не ўзгадаю ані літары. Верш падаваўся прыстойным і, чаго ўжо прыбядняцца, удалым, тым больш непасрэдна адрасаваным той, каму карцела яго прачытаць проста зараз.

Я саскочыў з ложка, апрануўся і выйшаў на калідор. Дзяжурны пост, асветлены настольнай лямпай, сустрэў маўклівасцю і адсутнасцю за сталом медсястры. Дзе яна магла быць мяне не цікавіла. Я нават узрадаваўся, што яе не было. Сеў за стол, узброіўся асадкай, што быццам чакала мяне паміж старонак бальнічнага журналу, разгорнутага, зноў жа як спецыяльна, чыстымі да мяне лістамі. Я меў, вядома, нататнік, які спаў, як і ўсё вакол, у кішэні скуранцы пад матрацам, але ўзгадаў пра яго ўжо на калідоры. Не вяртацца ж за ім, бо кожная секунда здавалася каштоўнай і любы лішні рух пагражаў майму вершу кануць у нябыт.

Запісваў хутка. Каб нічога не забыць. Потым некалькі разоў перачытаў, дзе-нідзе паправіў недакладнасці. Як толькі адкінуўся спінай на спінку крэсла з пачуццём годна выкананай справы, зазваніў тэлефон. Я яшчэ падумаў: вось бы гэта была Насця… Думка бязглуздая, натуральна, і, тым не менш, штосьці мне падказвала, што я павінен падняць слухаўку.

– Алё, – сказаў я ў трубку, але, па-мойму, выйшла так, быццам злодзей вырашыў адказаць на тэлефанаванне, што знянацку перашкодзіла яго прафесійнай дзейнасці ў якой-небудзь заможнай кватэры.

– Я ведала, што гэта будзеш ты, – агаломшыў мяне Насцін голас. Тое, што яна пазнала мой голас, не здзівіла. Ён пазнавальны адразу, хоць менавіта з-за яго я не паступіў вучыцца на актора. Таксама парадокс, пазнавальны голас, які, аднак не падыходзіў пад стандарты акторскіх галасоў у прыёмнай камісіі Акадэміі мастацтваў. Безэмацыйны, безжыццёвы, манатонны, мёртвы. Гэтымі чатырма словамі забілі маю мару стаць акторам на ўступных іспытах у тэатральную вну. Ім там, вядома, лепш бачна ці чутна збоку, не біцца ж было з імі. Таму я паступіў вучыцца на паэта, як Шукшын. З тым адрозненнем, што той прыехаў якраз мэтанакіравана з Алтая ў Маскву вучыцца на паэта, але паступіў у выніку на рэжысёра. – Не спіш? – як нічога ніякага запытала дзяўчына.

– Так, – пацвердзіў я. – А ты?

Што за бязглуздае пытанне? Відаць, з-за разгубленасці, і

нечаканасці, і неверагоднасці…

– Як бачыш, – адказала Насця. – Ці, лепш, як чуеш, – удакладніла.

– Нешта здарылася? – задаваў я дурацкія пытанні.

– Не, – адгукалася дзяўчына, – проста раптам захацелася пачуць твой голас, пачуць цябе, – прызналася. – Мо засну пасля. Скажы што-небудзь харошае, – папрасіла.

Голас яе быў ці здаваўся стомленым. Быццам яна адпрацавала дзве змены запар на цагельні ў гарачым цэху.

– З табой дакладна ўсё добра? – непакоіўся я.

– Цяпер добра, – з выдыхам адказала Насця. – Калі ты побач хаця б голасам. Абдымі мяне ім.

І я пачаў чытаць ёй верш, толькі што запісаны ў бальнічны журнал:

*Вечар,*
*Не забудзь пра плечы,*
*Што я параўнаў з шаўковай гладдзю белізны.*
*Плечы,*
*Масянжовы вечар,*
*Маёй мілай пані добрай ласкай атулі.*

Пасля непрацяглай паўзы Насця прамовіла:

– Прыгожа. Праўда, плячэй маіх ты не бачыў яшчэ, хоць параўнанне слушнае.

– Я верш гэты напісаў перад самым тваім званком, – паспяшаўся пахваліцца.

– Малайчына, – адгукнулася Насця. – Калі пабачыш са-

праўды мае плечы, напішаш штосьці больш праўдзівае.

– Табе не спадабалася? – ніякавеў я.

– Не, што ты, спадабалася, канешне, – запэўніла дзяўчына мяне ў адваротным, – і я абавязкова цябе прысню ў гадзінаў восем раніцы халоднай. Абяцаю. – Памаўчала і дадала: – Дзякую табе. Стала лягчэй.

Я не паспеў у яе запытаць больш нічога, бо ў слухаўцы загучалі кароткія гудкі.

Што гэта было? Трызненне наяве? Сон у сне?

Раніцай з кішэні кашулі я дастаў аркуш з бальнічнага журналу, на якім быў запісаны верш.

З самага ранку і на цэлы дзень зацерусіў дождж. Нават праз вокны адчувалася яго ныццё, падобнае на ныццё хворага зуба. Зрэшты, зуб – гэта ж костка, а костка балець не можа, тым больш ныць. Незадаволены чымсьці нервовы чарвяк, які сядзіць унутры зуба. Менавіта яго ныццё, якое нярэдка пераходзіць у невыноснае галашэнне, нібы яго рэжуць, і стварае пачуццё безвыходнасці ды жалю да самога сябе. Дождж за акном таксама нагадваў гэтага чарвяка, свідраваў душу, залазіў пад корку чэрапа і высмоктваў мозг з тупой прагнасцю зомбі. У маім выпадку яму і высілкаў асаблівых не патрабавалася. Дзірка ў галаве бесперашкодна дазваляла ўваходзіць усім, каму заўгодна, у сваё лона. Непрыгожы, нудны вулічны пейзаж, размыты дажджом, як сапсаваны фотаздымак, нагнятаў негатыў і ў памяшканнях 9-й бальніцы. Прыгнечанасць, безнадзейнасць, асуджанасць нябачным пы-

лам асядалі на кожным твары пацыентаў і правальваліся ў іх насы, вочы, вушы ды рты страчаным часам, часам, у якога не было ні будучыні, ні мінулага. Настрой узнікаў такі, што хоць кладзіся і памірай, усё адно нічога добрага нікога не чакала наперадзе. Раз-пораз я вымаў з кішэні верш, напісаны ўначы на аркушы з бальнічнага журналу, углядаўся ў літары вачыма і ненавідзеў яго. З ім неадкладна хацелася разабрацца, зрабіць балюча, калі не знішчыць. Вядома, ні ў чым вінаваты ён не быў, гэта ўсё дождж за акном, агідны, як гнілы зуб, псаваў настрой і выклікаў дзіўныя думкі пра змрочнасць быцця і немагчымасць кахання, у якое карцела верыць, як у Бога, але не верылася. Я памятаў начную тэлефонную размову з Насцяй да драбніц, аднак у сапраўднасць яе таксама не верылася. У сапраўднасць размовы і ў сапраўднасць Насці. Наяўнасць верша нічога не даказвала. Ён усяго толькі плод маёй фантазіі. А фантазія ў мяне працавала будзь здароў. За траіх запар. Усё жыццё маё – адна бясконцая фантазія. Мо я ўвогуле знаходзіўся пад прэпаратамі ў псіхушцы, скораны шызафрэніяй, і ўсё, што я лічыў сваім жыццём, – жыло выключна ў маёй галаве, асабліва Насця. Бо не магла яна ў сапраўднасці быць такой, якой была. Зрэшты, якой? Што я ведаў пра яе? Вось менавіта – нічога! Узялася невядома адкуль, прыходзіла і знікала заўсёды ў розных варыяцыях самой сябе ці, усё ж, не прыходзіла? Ці, усё ж, я яе выдумаў? А кніга? «Альтыст Данілаў», падораны ёй, які не чытаўся, бо замест тэксту на старонках я бачыў Насцін усмешлівы твар?

Зрэшты, я мог купіць кнігу сам. Трэба спусціцца ўніз і непасрэдна звярнуцца да беларускамоўнага якудзы. Ён павінен яе памятаць, зразумела, калі яна сапраўды купляла ў яго кнігу. Я не сумняваўся, што якудза не забыў Насцю. Такіх, як яна, не забываюць нават аднойчы пабачыўшы. Зразумела, у тым выпадку, калі яна існавала насамрэч.

Узяў куртку (выцягнуў з-пад матраца), з-пад падушкі выцягнуў кепку, пакінутую Янкам Лайковым, на ўсялякі выпадак прыхапіў і яе. Сказаў суседу па палаце – вахцёру з Купалаўскага тэатра, – што пайду праветруся (таксама на ўсялякі выпадак). Спусціўся ўніз, падышоў да кніжнага латка. Якудза быў на месцы.

– Паслухайце, – адразу звярнуўся да яго, працягваючы «Альтыста Данілава» як уліку, – вы памятаеце, хто купіў у вас гэтую кнігу?

– З ёю нешта не так? – занепакоена запытаў той, але не спяшаўся браць кнігу з маіх рук.

– Ды не, усё з кнігай так, – супакоіў я яго.

– Тады што, не разумею? – ветліва ўсміхаўся якудза.

– Вы памятаеце, хто яе купляў? – настойліва запытаў я.

– Вядома, – адказаў якудза.

– І хто? – нецярпліва пераминаўся я з нагі на нагу, нібы хацеў да ветру.

– Вы, – агаломшыў мяне адказам.

– У сэнсе я? – разгубіўся я і паплыў бы плаўлены сырок па патэльні.

– З вамі, праўда, была дзяўчына, – хутка дадаў ён. – Вы былі ўдвох з ёю. Яна купіла кнігу для вас, – працягваў якудза. – Вельмі прыгожая дзяўчына. Праўда, дзіўная. Поўная таямніц і загадак.

– Я дакладна быў не адзін, а з ёю? – ухапіўся за словы якудзы я, бы за саломінку тапелец.

– Так, – пацвердзіў якудза.

– Дзякую вам бязмежна, вы толькі што вярнулі чалавека да жыцця! – ледзь не палез я да якудзы з абдымкамі.

– Звяртайцеся, – ветліва ўсміхнуўся ён мне. – Заўжды рады дапамагчы.

Я выбег пад дождж, бы агонь, які патрабавалася пагасіць, ахоплены ўнутраным пажарам. Усё ж не звар’яцеў і ляжу не ў вар’ятні. А гэта значыць, што Насця сапраўды тэлефанавала ўначы і мы размаўлялі з ёй. Гэта значыць, што Насця – рэальны чалавек, а не вобраз, прыдуманы мной пад уздзеяннем атрыманай траўмы.

Кроплі дажджу намагаліся, рыхтык кулі, патрапіць у мой твар, які сядзеў, нібы ў доце, пад кепкай, чый брыль надзейна абараняў ад знешняга ўмяшальніцтва. Дождж злаваў, што не выходзіла па ягонаму, але ўзмацніць сябе, каб ударыць у поўную сілу, нечага яму не ставала. Мо не яго дзень быў. Ён церусіў, быццам трухаў, як старая заезджаная кабыла, існаваў толькі таму, што яму хтосьці дазволіў існаваць, але жалю да сябе не выклікаў, хутчэй смех. Так, дождж здаваўся смешным, хоць нічога смешнага ў яго трушку не заў-

важалася. Такі сабе сумны клоўн. І мой твар расплыўся ва ўсмешцы, недарэчнай, напэўна, і дзіўнаватай, ніякага дачынення не маючай да таго, як выглядаў дождж. Зашмат гонару для яго. Усміхаўся я Насці. Не, яна не з'явілася перада мной Сіўкай-Буркай, каб ашчаслівіць адным сваім выглядам, адной сваёй прысутнасцю, не. Усміхаўся я ўсведамленню, таму ўсведамленню, якое ў адначассе робіць з хлопчыкаў мужчын, хоць адказнасць пакуль яшчэ не пырхала крыламі за спінай у выглядзе матыля, але сігналіла недзе далёка наперадзе з нябачнага маяка аб сваім з'яўленні.

Я закурыў. З асалодай труціў лёгкія, якія, таксама з асалодай, прымалі ў сябе атруту: не меншыя за мяне наркаманы. Нас рознілі хіба што дозы і маштабы гэтых доз. Але параўнанне жывога чалавека, як сродка задавальнення, з цыгарэтамі падавалася блюзнерствам, якое, тым не менш, пасялілася, калі не ў сэрцы, то ў галаве дакладна, праз дзірку шуснула, бы ў нару і стаілася ў шэрым рэчаве вавёркай, пухнатым хвастом змятаючы з мозгу пыл дзён і начэй, які таксама праз дзірку прасочваўся сляпіцай.

Я ўжо вяртаўся ў будынак бальніцы, затрымаўся каля дзвярэй, прапускаючы праз іх жанчыну з клункамі, якая, відаць, прыехала аднекуль з вёскі праведаць мужа, ці сына, ці дачку, калі заўважыў Янку з Паўлам Гаспадынічам. Яны шпацыравалі па тэрыторыі ўпэўненай хадой маладосці. Я кінуўся ім насустрач, на хаду ўсмоктваючы ў сябе падзяку жанчыны за прытрыманыя дзверы. Падобная ветлівасць аджы-

вала сваё, бо ў моду ўваходзіла агрэсіўнае быдляцтва, што запаўняла сабой усе слаі грамадства з хуткасцю саранчы і знішчала прыстойнасць, а калі не атрымлівалася знішчыць, абʼяўляла слабасцю і спісвала за непатрэбнасцю ва ўтыль. Быкаванне прапаведвалася як рэлігія, невуцтва віталася бы панацэя ад усіх нягод. Моцны біў слабога і лічыўся героем. Сапраўдным героям ламалі хрыбты шакалінай зграяй і выкідалі з жыцця ў калодзежы смерці. Кінгаўская імгла сышла з-пад маіх вачэй, адпаўзла, выпаўзла з бальніцы і накінулася на горад бы шалёная. Мо таму і дождж церусіў, а не заліваўся залевай…

Мы парукаліся. Сябры з заняткаў. Перад тым, як адправіцца ў «Першацвет» на чарговае пасяджэнне літабʼяднання. Непрыгожа з майго боку, нікога не папярэдзіўшы ні з персаналу бальніцы, ні з яе пацыентаў было пайсці разам з хлопцамі, але як атрымалася, так атрымалася. Ва ўсім вінаваты дождж. Заўжды вінаваты хтосьці, а не ты сам, ці не так?

У Доме літаратара на Фрунзэ, 5, дзе на трэцім паверсе за адзінымі дзвярыма ў правым крыле знаходзілася рэдакцыя часопіса «Першацвет» і там жа праходзілі сустрэчы літабʼяднання, народу ўжо было багата, калі мы зайшлі ў тыя самыя дзверы, напята іх адчыніўшы.

– А вось і класікі зʼявіліся, не запыліліся, – агучыў наш прыход Алесь Герасімавіч Масарэнка, звяртаючыся да дзяўчат, якія былі тут упершыню і сядзелі ўздоўж стала так, што яблыку не знайшлося б месца ўпасці, калі б проста над ста-

лом расла яблыня. «Класікамі» Алесь Герасімавіч называў усіх, хто больш-менш стала друкаваўся ў часопісе, без іроніі, але і не ўсур'ёз, хутчэй з бацькоўскай пяшчотай.

Дзяўчаты вылупіліся на нас цікаўнымі кацянятамі і ва ўсе вочы разглядалі тых, каго назвалі класікамі, хоць тым класікам, ніводнаму з іх, яшчэ і 20 гадоў не было.

Мы па чарзе парукаліся з Алесем Герасімавічам. Затым я пачуў ззаду сябе густы пастаўлены тэатральны голас Сяргея Патаранскага.

– Жывы, дзядзька! – з вышыні свайго недасяжнага росту ён цягнуў вялікую і шырокую, бы рыдлёўка, далонь. – Віншую!

Мы парукаліся. Я, праўда, не зусім зразумеў, з чым той мяне віншаваў. З тым, што жывы, ці з нечым іншым, бо неяк загадкава ўсміхаўся і падміргваў.

– Так, віншуем, Мікола, – абступілі мяне Янка з Паўлам, – з чарговай публікацыяй! Прабач, не паспелі сказаць.

Янка палез ва ўнутраную кішэню курткі і выцягнуў новы нумар «Першацвета», які адно выйшаў, з маімі вершамі.

– А хто гэта? Хто? – пачуліся прыглушаныя галасы дзяўчат. Напэўна, яны пыталіся адна ў другой у спадзеве, што нехта з іх ведае маё прозвішча. Алесь Герасімавіч працягнуў асобнік часопіса дзяўчыне, што сядзела бліжэй да яго на разгорнутай старонцы з маімі вершамі, над якімі, натуральна, былі змешчаны і мой фотаздымак з імем ды прозвішчам. Астатнія дзяўчаты скупкаваліся вакол уладальніцы асобніка,

зазіралі ёй праз плячо і галаву, каб таксама прычасціцца да добрага, светлага, вечнага.

– Трэба адзначыць, – намякаў Патаранскі мне, што не перашкодзіла б замачыць публікацыю, каб тая не сталася апошняй. Праз гадоў пятнаццаць яго каля пад’езда ўласнага дома нейкія ўпыры паб’юць так, што жывога месца не застанецца на целе. Хадзіць ён зможа адно па хаце пры дапамозе хадункоў. Моўны апарат будзе настолькі пашкоджаным, што пры размове з паэтам яго не адразу зразумееш. Самае страшнае, што пра Патаранскага ўсе забудуць. Аднак ён паспее зняць чатыры значныя дакументальныя стужкі, адна з якіх, прысвечаная Анатосю Сысу, набудзе статус культавай. На жаль, Сыс ніколі той фільм не пабачыць.

Я разглядаў сябе на старонцы з вершамі ў часопісе, доўгавалосага, усмешлівага, знятага ў фотастудыі на Маскоўскай у Доме быту. Чаго я ўсміхаўся тады? Чаму можна было ўсміхацца ў мёртвай студыі Дому быта? Я не памятаў. Хутчэй за ўсё выконваў просьбу фатографа, бо сказаў, дзеля чаго мне патрабавалася фота. Так, менавіта ён параіў мне ўсміхацца, каб спадабацца дзяўчатам, якія будуць гартаць часопіс. З усмешкай больш запамінальны твар, да таго ж выклікае давер. А я, відаць, хацеў быць сур’ёзным, ды з жаданнем маім фатограф не пагадзіўся і настояў на сваім. І меў рацыю. Вунь як дзяўчаты разглядаюць фота, а не яго арыгінал. Зрэшты, усё лагічна. Арыгінал – лысы, вушасты, у дзьмухаўцовай барадзе – не меў нічога агульнага з тым, хто ўсміхаўся

з фотаздымка.

– Ну дык як? – не адставаў Патаранскі.

– Сяргей, – звярнуўся да яго Янка, – нічога, што Мікола адно з бальніцы і ў бальніцу яму вяртацца?

– Ды мы па пяць кропель усяго, – быццам не чуў яго Сяргей. – А гэта ж святая справа, – кіўнуў на часопіс у маіх руках.

– Добра, – пагадзіўся я, бо і самому захацелася адзначыць. Не кожны дзень здараліся публікацыі, то чаму і не адносіцца да іх як да свята.

Але не спяшыў.

Спачатку мы, па чарзе, прачыталі новыя вершы. Патаранскі чытаў больш і дольш за ўсіх. Ён любіў публіку, а публіка яго. Творы свае ён не чытаў, а дэкламаваў, называў іх то опус такі, то накцюрн сякі, то п’еса, то сцэна, то ўверцюра, то паланез… Карацей, намагаўся кожны верш выдаць за музычны твор, напісаны, аднак, не нотамі, а літарамі. Ці атрымалася ў яго? Яму апладавалі стоячы.

Ну а потым рушылі да «Жако», каб затарыцца некалькімі фаўстамі «Вермута», і зноў вярнуліся, але ў Дом літаратара ўжо не заходзілі, спыніліся на прыступках, што тырчалі збоку ад будынка іншародным прыдаткам, пад разгалістым дрэвам. І тут таксама чыталіся вершы, але не тыя, якімі можна б было падзяліцца на літаб’яднанні. Больш смялейшыя, больш мацнейшыя, больш такога кшталту, за якія б у 1937 годзе расстралялі без суда і следства.

Паступова літаб'яданне перабралася з трэцяга паверха Дому літаратара, бо час быў не гумовы і будынак зачыняўся да заўтра, да вулічнай лесвіцы, акупаванай намі пад высокім разгалістым дрэвам. Месца было казырнае. З аднаго боку яго хавала дрэва ад непатрэбнай увагі мінакоў, зрэшты, нецікаўных і даволі рэдкіх, бо вуліца не назаляла небу і сонцу шматлюднасцю, з другога – важкія і таксама высокія каменныя парэнчы, за якімі хаваліся і, уласна, лесвічныя прыступкі, і мы ўсе, як паселі на тых прыступках. З вуліцы нас не было відаць, адно чуваць, бо размаўялі мы гучна пад уздзеяннем «Вермута». Алесь Герасімавіч развітаўся з намі і пайшоў у бок метро, праўда, пагрозліва ці, мо, папераджальна пахітаў пальцам, маўляў, будзьце асцярожныя, хлопцы. Разам з ім сыходзілі дзяўчаты, абступіўшы паўколам яго грузную паставу. Зрэшты, не ўсе. Некаторыя далучыліся да нашай грамады. Напэўна, з-за Патаранскага. Ён быў найстарэйшым за нас і вучыўся ў Акадэміі мастацтваў на актора і рэжысёра, пра што ніколі не забываўся ўдакладняць пры знаёмстве з дзяўчатамі, намякаючы такім чынам на сваё светлае будучае ў кіно ды тэатры. Натуральна, кожная вялася. Ды ён і не маніў, да таго ж валодаў такім тэмбрам голасу, які зачароўваў з першага гуку рамантычна-узнёслыя душы маладзенькіх паэтак, якія, хутчэй за ўсё, нават марылі памыліцца, ашукацца ў ім, але пакінуць на памяць тое, што потым можна будзе выкарыстаць ва ўласнай творчасці. Ну і знешнасць меў Патаранскі артыстычную ў дадатак да творчага таленту.

Ён не толькі пісаў вершы і марыў перавярнуць з ног дагары тэатральны і кінематаграфічны свет, як зрэшты, і кожны з нас, адно што іншы свет – літаратуры; ён пісаў музыку, пісаў карціны, пісаў п'есы, пісаў празаічныя творы. І з першага погляду закохваў у сябе. Таму не дзіўна, што дзяўчаты ліплі да яго, як мухі на мёд. Іншая справа, сам ён адносіўся да іх легкадумна. Дый мы, калі шчыра, таксама ў легкадумнасці мала чым адрозніваліся ад яго. Увага дзяўчат, так, акрыляла, падвышала самаацэнку, прымушала выпінаць грудзіну і хадзіць гогалем, але не больш за тое. Сур'ёзныя адносіны? Якія сур'ёзныя адносіны, калі мы такія маладыя, а дзяўчат процьма, і самых розных ды на любы густ! Мы нават да Паэзіі ставіліся як да каханкі ў большай ці меншай ступені, а не да каханай дзяўчыны, хоць па-блазенску казалі, што адданыя да канца жыцця толькі ёй і больш нікому. На філфаку, сустракаючыся перад заняткамі або пасля іх, збіраліся ў прыбіральнях і чыталі вершы там, не каб прынізіць, вядома, Паэзію, а падкрэсліць інтымнасць нашых адносін з ёй. Панядзелкі ў «Першацвеце» чакалі з нецярпеннем штотыдзень, хоць бачыліся кожны дзень на факультэце, як спаткання з жаданай дзяўчынай, асабліва ў нефармальнай абстаноўцы, пасля афіцыйнага пасяджэння, якое, зрэшты, ніякім афіцыйным пасяджэннем не было. Там мы знаёміліся, каб потым, на вуліцы, знаёмства тое ўзмацніць. Там мы дыхалі і не маглі надыхацца водарам чысціні, метафар, строф… Паэзія, здавалася, зазірала ў душу кожнага з нас там, цалавала, лашчыла

і абяцала хуткую сустрэчу з сабой сам-насам неўзабаве. Мы верылі. Мы любілі. Мы ведалі, хто мы. І не сумняваліся ў сваім веданні. Алкаголь, які мы прымалі, не разбураў тое, аб чым нас палохалі. Наадварот, ён трымаў нас поруч. І мярзотны, зацугляны небам зранку дождж таксама нічога дрэннага не мог нам зрабіць.

Тым не менш час не стаяў на месцы. Мне трэба было вяртацца ў бальніцу. Янка праводзіў мяне да самых дзвярэй. Але спачатку мы пасадзілі Паўла на аўтобус да Сокала. У раён, дзе ён жыў, рэдка хадзіў транспарт. Мы мусілі ўпэўніцца, што ён даедзе. На развітанне абняліся.

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «Литрес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на Литрес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.